© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

БАЦЬКАЎШЧЫНА

ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „BAČKAUŠČYNA“ („VATERLAND“)

Herausgeber: Wladimir BORTNIK
Die Administration: München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III

Druck: „LOGOS“, Buchdruckerei u. Verl., G.m.b.H., München 8, Rosenheimer Str. 46 a

Цана паза Нямеччынай: ЗША — 15 цэнтаў, Канада — 15 ц., Ангельшчына — 1 шылінг, Францыя — 40 фр., Бэльгія — 5 фр., Аўстралія — 1 шылінг, Арґэнтына — 2 пэзо. У іншых краінах раўнавартасьць 15 ам. цэнтаў. Падпіска на год — з разьліку 52 нумароў, на паўгода — 26 нумароў, на 3 месяцы 13 нумароў паводля вышэйшае цаны. Цана лётніцкай поштай у заакіянскія краіны — 30 ам. цэнтаў. — Падвойныя нумары каштуюць падвойна

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE“ | DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND“ | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND“

№ 36 (167) Нядзеля 13 верасьня 1953 г. ГОД ВЫДАНЬНЯ 7

Амэрыка унезалежніваецца

Замежная палітыка Амэрыкі на працягу апошніх год не заўсёды была дакладным адбіцьцём імкненьняў Вашынгтону, як і настрояў бальшыні амэрыканскага грамадзянства. Амэрыка, будучы зьвязанай з Эўропай і не жадаючы аслаблівацъ гэтае сувязі, нярэдка адыходзіла ад сваей аснаўной палітычнай лініі, каб дагадзіць Эўропе, ці, іншымі словамі, ішла ёй на кампраміс. Гэта датычыла ў першую чаргу дачыненьняў да камунізму наагул і антыкамуністычнае палітыкі на Далёкім Усходзе ў васаблівасьці.

Адмова Амэрыкі ад «палітыкі вызваленьня», праклямаванай рэспубліканцамі ня толькі перад прэзыдэнцкімі выбарамі, але і ў пачаткавым пэрыядзе іхнае ўлады, ды зьняцьце з парадку дня праекту рэзалюцыі прэзыдэнта Айзэнгаўэра аб нявызнаваньні савецкіх нарушэньняў ялтанскага дагавору ў вялікай меры й былі вынікам гэтага кампрамісу з капітулянцкімі тэндэнцыямі Заходняй Эўропы. Імкненьне дагадзіць Эўропе, перадусім Вялікабрытаніі, асабліва моцна заважыла на амэрыканскай палітыцы на Далёкім Усходзе. Калі Амэрыка вяла карэйскую вайну з выразным намерам, каб гэтай вайны ня выйграць, калі ўшаноўвала недатыкальнасьць усіх тых камуністычных ваенных базаў, што знаходзіліся паза межамі Паўночнае Карэі, калі адклікала із становішча галоўнакамандуючага на Далёкім Усходзе генэрала Мэк Артура, які прапанаваў адзіна правільную стратэгію ў гэтай вайне, якая адкрывала шлях да поўнае перамогі над камуністымі, дык ува ўсім гэтым быў націск Заходняй Эўропы, зь якой Амэрыка ўважала за патрэбнае аж да такой меры лічыцца.

Гэтае лічэньне з Эўропай, асабліва ў сувязі з карэйскім пытаньнем, нярэдка стварала дзіўныя парадоксы. Бо вось бадай што ўвесь цяжар карэйскай вайны ўзяла Амэрыка на свае собскія плечы, панесла ў ёй вялізарныя страты ў людзях і матарыялах, а ейная ініцыятыва ў гэтай вайне была непамерна зьвязваная Вялікабрытаніяй, удзел якой у гэтай вайне быў амаль што толькі сымбалічны, бо не ўважала яна за патрэбнае выслаць на карэйскі фронт навет цэлай дывізіі сваіх войскаў. Калі хадзіла пра ўклад у вабарону перад супольным ворагам, дык Эўропа давала мінімум, хаця й магла здабыцца на большае, затое ў вырашэньні праблемаў гэтае абароны прэтэндавала ня толькі да роўнага з Амэрыкай голасу, што ня было-б яшчэ дзіўным, але параліжавала разумную амэрыканскую акцыю, ведзеную ў інтарэсах самой-жа Эўропы. Найлепей гэта выявілася ў дасюлешняй гісторыі тварэньня эўрапэйскай абароннай супольнасьці. Як ведама, Амэрыка прывязвае вялізарную вагу да эўрапэйскае арміі, гатовая даваць для яе вялікую фінансавую помач, тымчасам справа гэтая з выключнай віны заходняэўрапэйскіх дзяржаваў упёрлася на мёртвым пункце і мала ёсьць надзеі, каб яна калі-небудзь зрэалізавалася. Прэзыдэнт Айзэнгаўэр у сваей прамове з 16 красавіка высунуў некалькі разумных перадумоваў, пры выкананьні якіх бальшавікі далі-б довад шчырасьці сваіх мірных гэстаў і расчысьцілі-б дарогу да канкрэтных перагавораў. Але ўсьлед за гэтым 11 травеня брытанскі прэм'ер Чэрчыль пасьпяшыў аслабіць гэтую амэрыканскую пазыцыю, аўтарытэтна заяўляючы, што Савецкі Саюз узапраўды эвалюцыянуе ў кірунку мірнай палітыкі, і дамагаючыся гаварыць зь ім базь ніякіх папярэдніх перадумоваў. Бадай што ўсе краіны Заходняй Эўропы зьяўляюцца сяньня жабракамі Амэрыкі й знаходзяцца на ейным утрыманьні. З гэтае амэрыканскае помачы яны ахвотна карыстаць, але, з другога боку, уважаюць за пункт свайго гонару знаходзіцца ў апазыцыі да амэрыканскай замежнай палітыкі, паралiжуючы ў вялікай меры ейную антыкамуністычную акцыю. Вытварылася такое палажэньне, што ў дачыненьні да Амэрыкі Заходняя Эўропа адыгрывае ролю прыказачнага пятага кола ў возе, якое нічым не памагае ў язьдзе, але клопатаў прыносіць ня мала.

Такая пазыцыя эўрапэйскага Захаду пачынае ўрэшце дэнэрваваць Амэрыку. Там што раз часьцей пачынаюць падносіцца галасы, што паколькі Амэрыка сама нясе фактычную адказнасьць за лёс вольнага сьвету і дае аснаўны ўклад у ягоную абарону, непрапарцыянальна вялікі ў параўнаньні зь іншымі заходнімі дзяржавамі, патолькі мае яна права й павінна весьці сваю палітыку самастойна, не агледаючыся на сваіх саюзьнікаў. Ужо нябожчык сэнатар Робэрт Тэфт, як правадыр рэспубліканскай фракцыі ў сэнаце, у сваей апошняй прамове, сказанай хутка перад сьмерцю, паставіў быў дамаганьне грунтоўнай рэвізіі амэрыканскай замежнай палітыкі. Ён радзіў, што, паколькі Эўропы нельга аздаравіць амэрыканскімі далярамі, Амэрыка павінна яе пакінуць ейнаму собскаму лёсу, а што датычыцца карэйскай палітыкі, ён дамагаўся ў ей для Амэрыкі вольнае рукі й не вязаньня сябе з палітыкай Задзіночаных Нацыяў.

Прэзыдэнт Айзэнгаўэр тады афіцыяльна выступіў супраць такой канцэпцыі сэнатар Тэфт, г. зн. на шлях поўнага ўнеця можа пакінуць сваіх саюзьнікаў. Прэзыдэнт Айзэнгаўэр, як галава дзяржавы, іначай і ня мог заявіць. Але апошнія выпадкі паказваюць, што Амэрыка, пры-

(Заканчэньне на 2-ой балоне)

КАНЕЦ ЦІ ПЕРАПЫНАК?

(НАВАКОЛ МЮНХЭНСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ)

Пачынаючы зь 1-га верасня салён гатэлю «Рэгіна», дзе канфэравалі амаль ад раньня да познай ночы галоўным чынам дэлегаты Парыскага Блёку, пачаў што раз радзець публікай, а сяньня (4. 9. 53) зусім апаражніўся.

Чым гэта ўсё кончылася? Якія вынікі з гэтай так напружанай і нэрвовай роўна трохмесячнай канфэрэнцыі, мэтай якой, як ведама, было стварэньне запраўднага міжнацыянальнага каардынацыйнага цэнтру антыбальшавіцкага змаганьня?

Бязумоўна, вывады аб канчальных выніках самой канфэрэнцыі рабіць сяньня было-б яшчэ за рызыкоўна. Ёсьць аднак рад дадзеных, на аснове якіх можна з пэўнасьцю сьцвердзіць, што трохмесячная канфэрэнцыя ў Мюнхэне мела вялікія пазытыўныя дасягненьні, і то ня толькі для паняволеных бальшавізмам нерасейскіх народаў у кірунку стварэньня супольнага антыбальшавіцкага фронту, але й для Амэрыканцаў, тых Амэрыканцаў, якія запраўды шчыра шукалі сабе саюзьнікаў паміж паняволеных бальшавізмам народаў дзеля змаганьня з апошнім. І калі сяньня Амэрыканскі Камітэт яшчэ хістаецца зацьвердзіць ці не зацьвердзіць новаствораны МАКЦ, а ў афіцыйным камунікаце для прэсы адмірал Стывэнс заклікае яшчэ раз усю дэмакратычную эміграцыю да задзіночаньня, бачучы яе яшчэ не дастаткова прадстаўленай і ў МАКЦ-е, то нельга аднак не дабачваць, што, паза гэтымі ўсімі афіцыяльнымі заявамі, прабіваюцца й пэўныя ноткі прагрэсу сярод Амэрыканцаў і прынятых імі актаў, якія сьветчаць аб поступе і глыбейшым зразуменьні (хоць мо' яшчэ ня зусім) нацыянальнай праблемы.

Першай такой праявай зразуменьня Амэрыканцамі нацыянальнай праблемы паняволеных народаў, а разам з гэтым і азнакай, якая сьветчыла аб шуканьні Амэрыканскім Камітэтам аб'ектыўнага выхаду з заіснаваўшага ненармальнага палажэньня, быў акт разьвязаньня КЦАБ-у. Арганізацыя гэтая пры такой яе арганізацыйнай структуры, а галоўнае — палітычным кірунку ейных кіраўнікоў — Расейцаў, захапіўшых у ей кіраўніцтва, намагалася падмяніць там за-

ВЫПІСВАЙЦЕ Й ПАШЫРАЙЦЕ БЕЛАРУСКІЯ КНІЖКІ ВЫДАВЕЦТВА «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ»!

праўдныя нацыянальныя прадстаўніцтвы рознымі авантурыстычнымі й дывэрсійнымі крэатурамі, у бальшыні выпадкаў тымі-ж Расейцамі для гэтае мэты ад гок і створанымі. Не магла, зразумела, гэткая арганізацыя (КЦАБ) адыграць інакшай ролі, як толькі нэгатыўную, каб не сказаць проста, што арганізацыя гэтая якраз адказвала жаданьням бальшавікоў з прычыны неэфэктоўнасьці ейных уплываў на паасобныя народы з аднаго боку, і ейнага дывэрсійнага, раскладальнага дзеяньня на запраўдныя нацыянальна-вызвольныя рухі — з другога.

Трохмесячная канфэрэнцыя ў Мюнхэне, на якую прыбылі ўзапраўды кваліфікаваныя й аўтарытэтныя прадстаўнікі паняволеных нерасейскіх народаў, іхная саліднасьць, павага й сіла аргумэнтацыі і адыйгралі тую ролю, што Амэрыканскі Камітэт, ня хістаючыся, прыняў дэцызію зьліквідаваць тое асінае гняздо КЦАБ-у, якое стаяла на перашкодзе як нацыянальным прадстаўніцтвам паняволеных народаў, гэтаксама й Амэрыканцам. А гэтага ўжо нельга ня лічыць за вялікі крок наперад.

Падругое, трохмесячная канфэрэнцыя пад сталым наглядам ды пры ўдзеле найбольш адказных прадстаўнікоў Амэрыканскага Камітэту ня можа прайсьці для іх незаўважанай. Яны не маглі не пабачыць розьніцы між запраўднымі імкненьнямі

(Заканчэньне на 2-ой балоне)

Палітычныя Навіны

(1-7 ВЕРАСЬНЯ 1953)

Дальлес пагражае камуністым. Міністар замежных справаў ЗША Дальлес у сваей прамове, сказанай перад Амэрыканскім Легіёнам 2 верасьня, зьвярнуўся да камуністычнага Кітаю зь перасьцярогай, што ягонае эвэнтуальнае збройнае ўмяшаньне ў індакітайскую вайну пацягне за сабой «цяжкія для яго вынікі», якія ня будуць абмяжоўвацца толькі да Індакітаю. Калі-ж камуністыя асьмеляцца ўзнавіць агрэсію на Карэі, дык яны «не павінны ўжо лічыцца з тым, што гэтым разам у Манджурыі будуць мець упрывілеяванае недатыкальнае заплечча». У сувязі з гэтым Амэрыканскі Легіён прыняў рэзалюцыю, у якой дамагаецца ўжыцьця ўсіх мілітарных сяродкаў уключна з атамнай і вадароднай бомбай у выпадку, калі палітычная канфэрэнцыя ў справе Карэі ня дасьць ніякіх пазытыўных вынікаў.

Заходняя нота Савецкаму Саюзу ў справе Нямеччыны. У вадказ на савецкія ноты ў справе Нямеччыны з 4 і 15 жнівеня тры заходнія вялікадзяржавы — ЗША, Вялікабрытанія й Францыя ў сваей ноце з 2 верасьня запрашаюць Савецкі Саюз адбыць канфэрэнцыю ў гэтай справе ў Люгано 15 кастрычніка сёлета. Адначасна заходнія дзяржавы запрапанавалі наступны парадак дня канфэрэнцыі: 1. справа правядзеньня агульнанямецкіх свабодных выбараў, якія будуць істотным крокам на дарозе да задзіночаньня Нямеччыны й заключэньня зь ёй мірнага дагавору, 2. канчальнае пагадненьне ў справе мірнага дагавору з Аўстрыяй. Савецкае дамаганьне, каб спачатку стварыць часовы агульнанямецкі ўрад з прадстаўнікоў урадаў Усходняй Нямеччыны й Заходняй Нямеччыны і склікаць на працягу шасьці месяцаў мірную канфэрэнцыю дзеля падпісаньня мірнага дагавору яшчэ перад задзіночаньнем Нямеччыны ды запрасіць на гэтую канфэрэнцыю й чырвоны Кітай, заходнія дзяржавы катэгарычна адкінулі.

Вымена ваеннапалонных афіцыяльна закончаная. Вымена ваеннапалонных у Карэі афіцыяльна закончылася 6 верасьня. Задзіночаныя Нацыі перадалі камуністым роўна 70,158 Паўночных Карэйцаў і 5,639 камуністычных Кітайцаў. Камуністыя выдалі Задзіночаным Нацыям 7,842 Паўдзённых Карэйцаў і 4,910 жаўнераў альянцкіх. Амэрыка абвінавачвае камуністых, што згодна зь ейнымі дадзенымі камуністыя выдалі ня ўсіх ваеннапалонных збройных сілаў ЗН.

Дзе адбудзецца палітычная канфэрэнцыя ў справе Карэі? ЗША зьвярнуліся да швэдзкага ўраду, які мае сваё пасольства ў Пэкіне, з просьбаю запытаць кітайскі камуністычны ўрад, ці ён возьме ўдзел у палітычнай канфэрэнцыі ў справе Карэі. Адначасна ЗША запрапанавалі на месца гэтай канфэрэнцыі Жэнэву, Сан Франціско або Гонолюлю і зазначылі, што яны згаджаюцца й на іншае месца, калі-б ніводнае з вышэй успомненых камуністым не адказвала.

Саветы маюць памагчы ў вадбудове Паўночнай Карэі. Камуністычнае радыё ў Пэкіне паведаміла 3 верасьня, што Савецкі Саюз асыгнуе адзін мільярд рублёў на адбудову зьнішчаных вайной прамысловых аб'ектаў Паўночнай Карэі. Між іншым, за гэтую суму маюць быць адбудаваныя вялізарныя электрастанцыі на рацэ Ялю, якія ў 1952 г. былі зьнішчаныя бамбардаваньнем Задзіночаных Нацыяў.

ЗША прапануюць перагаворы ў справе Індакітаю. Амэрыканскі міністар замежных справаў Дальлес на сваей апошняй тыднёвай прэсавай канфэрэнцыі заявіў, што Амэрыка гатовая да перагавораў у справе дасягненьня міру ў Індакітаі і ў справе іншых азіяцкіх праблемаў, калі камуністыя будуць супрацоўнічаць у справе ўстанаўленьня трывалага міру ў Карэі. Ён запрапанаваў, што гэтыя пытаньні могуць быць абмеркаваныя на другой канфэрэнцыі, пасьля палітычнай канфэрэнцыі ў справе Карэі, да якой былі-б прыцягнутыя далейшыя краіны, між іншым тры дзяржавы Індакітаю: Ветнам, Камбоджа й Ляёс.

І Пэкін за перагаворамі ў справе Індакітаю. Пэкінскае радыё падало 3 верасьня, што кітайская народная рэспубліка ўважае, што ўжо надыйшоў час, каб распачаць перагаворы ў справе Індакітаю. Правадыр камуністычных паўстанцаў у Індакітаі Го-Чы-Мін заявіў 2 верасьня, што Індакітай толькі ў тым выпадку згодзіцца на мір, калі краіна атрымае «запраўдную незалежнасьць і адзінства».

Ціта за інтэрнацыяналізацыю Трыесту. Югаславянскі прэзыдэнт маршал Ціта ў сваей прамове, сказанай 6 верасьня ў горадзе Окрогліца блізка італьянскай граніцы, запрапанаваў, як найлепшую магчымасьць заканчэньня югаславянска-італьянскіх спрэчак, надаць Трыесту статус інтэрнацыянальнага гораду, а тэрыторыі, паложаныя за гэтым горадам, прылучыць да Югаславіі.

Справа Марока ня будзе разглядацца на Радзе Бясьпечнасьці. Дамаганьне азіяцкіх і афрыканскіх краінаў заняцца пытаньнем Марока 3 верасьня не здабыло вымаганай бальшыні 7 сяброў у Радзе Бясьпечнасьці. За прапазыцыю галасавалі Савецкі Саюз, нацыянальны Кітай, Чылі, Пакістан і Лібанон. ЗША, Вялікабрытанія, Францыя, Калюмбія й Данія высказаліся супраць, а Грэцыя паўстрымалася ад голасу. Краіны, што галасавалі супраць праекту, матывавалі гэта тым, што палажэньне ў Мароко не загражае міру. Ня гледзячы на гэта, 8-ая пленарная сэсія ЗН, якая распачнецца ў Нью Ёрку 15 верасьня, пытаньне Марока й Тунісу паставіла на парадку дня й будзе яго абмяркоўваць.

Чэрчыль перабудоўвае брытанскі ўрад. Брытанскі прэм'ер Чэрчыль, які пасьля доўгага адпачынку пераняў свае абавязкі, паведаміў 3 верасьня аб рэканструкцыі свайго габінэту. Зьмена не датычыць міністэрства замежных справаў, якім і надалей будзе кіраваць Ідэн. Затое зьмененыя міністры міністэрства каардынацыі, міністэрства забясьпечаньня й міністэрства заморскага гандлю.

ЗША памагаюць Пэрсіі. Задзіночаныя Штаты ў канцы мінулага тыдня прызналі Пэрсіі дадатковую гаспадарскую помач у суме 45 мільёнаў даляраў. Гэтыя грошы былі прызнаныя прэзыдэнтам Айзэнгаўэрам у рамах мілітарнай і тэхнічнай помачы для Пэрсіі і маюць на мэце павышэньне жыцьцёвага стандарту ўсіх слаёў пэрскага насельніцтва. Некалькі дзён раней ЗША прызналі Пэрсіі тэхнічную помач на суму 23 мільёнаў даляраў.

Ветнамскія нацыяналістыя ўзмацняюць антыфранцускую акцыю. Камуністычная ветнамская армія прадпрыняла крокі, каб перацягнуць на свой бок ветнамскіх нацыяналістых, якія задзіночыліся ў новаствораным «Нацыянальным Руху за мір». Гэтая арганізацыя, да якой належаць вядучыя духоўнікі ўсіх рэлігійных групаў Індакітаю, абвесьціла 5 жнівеня праклямацыю, у якой закідаецца Францыі вядзеньне ў Індакітаі «імпэрыялістычнай вайны». Вярхоўныя францускія ўрадаўцы ў Індакітаі ўважаюць гэтую праклямацыю за «вельмі сур'ёзнае зьявішча».

Справа ваеннапалонных у ЗН. Генэральны сакратар ЗН Даг Гамэрск'ельд афіцыяльна падаў да ведама, што 8-ая пленарная сэсія ЗН, якая распачнецца 15 верасьня ў Нью Ёрку, паставіць на парадку дня адмову СССР звольніць усіх ваеннапалонных другой сусьветнай вайны. Асновай для дэбатаў над гэтым пытаньнем будзе справаздача зь дзейнасьці Камісіі для справы ваеннапалонных, якая цяпер працуе ў Жэнэве. Паводля матарыялаў, пададзеных гэтай Камісіі Заходняй Нямеччынай, Італіяй і Японіяй, роўна 2,3 мільёнаў ваеннапалонных гэтых дзяржаваў трымаюць у сябе Саветы.

Самаліквідацыя калгасаў у Ўсходняй Нямеччыне. Да палавіны жнівеня сёлета роўна 1,486 із агульнай колькасьці 5,600 калгасаў у Ўсходняй Нямеччыне самаразьвязаліся на аснове апошніх палёгкаў у сувязі зь нядаўна ўведзеным у Ўсходяй Нямеччыне «новым курсам».

Бэдэль Сьміт аб мілітарнай магутнасьці СССР. Заступнік міністра замежных справаў ЗША Бэдэль Сьміт, які пасьля другой сусьветнай вайны быў амэрыканскім амбасадарам у Маскве, у сваей нядаўнай прамове ў Чыкаго зьвярнуў увагу на тое, што магутнасьць Задзіночаных Штатаў і іхных саюзьнікаў зьяўляецца яшчэ недастатковай, каб загарантаваць бясьпечнасьць вольнага сьвету перад варожым да яго Савецкім Саюзам. Ён між іншым заявіў: «Савецкі Саюз мае нячуваную мілітарную сілу. Ён мае ўсе магчымасьці гэтую сваю сілу выкарыстаць. Ён мае найвялікшую армію ў цэлым сьвеце. Ён мае атамную бомбу і мае ўсе магчымасьці гэтай бомбай паслугоўвацца. Верхаводы Савецкага Саюзу ўжо ня раз даказалі сваю няпрымірлівую варожасьць да нашага спосабу жыцьця й нашых ідэялаў».

Амэрыканцы супраць ізаляцыянізму. Амэрыканскі Інстытут др-а Галюпа дзеля дасьледваньня публічнай апініі абвесьціў 5 верасьня вынікі апытаньня амэрыканскіх грамадзян, зь якіх вынікае, што 78% усіх Амэрыканцаў адкідаюць палітыку ізаляцыянізму й высказваюцца за супрацоўніцтвам ЗША зь іншымі нацыямі сьвету. Толькі 15% апытаных адкідаюць супрацоўніцтва ЗША зь іхнымі альянтамі, а 7% паўстрымалася ад заняцьця становішча. Характэрна, што 85% былых удзельнікаў другой сусьветнай вайны высказаліся супраць ізаляцыянізму.

Спроба самагубства савецкага пасла ў Тэгеране. Савецкае пасольства ў Тэгеране войстра выступіла супраць распаўсюджваных чутак аб спробе самагубства пасла СССР у Пэрсіі Анатоля Лаўренцьева, выясьняючы, што ён меў атак сэрца й цяпер зьяўляецца хворы. Аднак пэрскія газэты здагадваюцца, што Лаўрэньцьеў быў абвінавачваны за няўдачу ў спробе захвату ўлады ў Пэрсіі камуністымі й адкліканы ў Маскву, дзеля чаго намагаўся пакончыць самагубствам.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Палітычныя Падзеі

Нямеччына высказалася за Захадам

Зь вялікім напружаньнем у цэлым заходнім сьвеце чаканыя парляманцкія выбары ў Заходняй Нямеччыне адбыліся ў нядзелю 6 верасьня й прынесьлі бліскучую перамогу дасюлешняму заходнянямецкаму канцлеру др-у Адэнаўэру й ягонай хрысьціянска-дэмакратычнай партыі. Нямецкі народ паказаў у гэтых выбарах, што ён супраць нэўтралізму сацыял-дэмакратаў, а таксама й супраць скрайных як левых, гэтак і правых угрупаваньняў. Амаль 60% усіх 33 мільёнаў выбіральнікаў, 86,2% якіх прынялі ўдзел у галасаваньні, высказаліся за прадаўжэньнем дасюлешняй нямецкай замежнай палітыкі цеснага супрацоўніцтва з Захадам. Затое камуністыя, якія ў папярэдніх выбарах у 1949 годзе здабылі 15 мандатаў, нэўтралістыя і нэагітлераўцы («Дойчэ Райхспартай») не правялі аніводнага кандыдата.

У новым бонскім парляманьце будуць заступленыя наступных шэсьць нямецкіх партыяў: хрысьціянскія дэмакраты д-ра Адэнаўэра — 244 мандаты (у папярэдніх выбарах у 1949 г.: 139 мандатаў), што становіць пры ўсіх 478 мандатах разам, абсалютную бальшыню. Далей ідзе апазыцыйная партыя сацыял-дэмакратаў Оленгаўэра, якая здабыла 150 мандатаў (у 1949: 131), ліберальная Вольная Дэмакратычная Партыя — 48 мандатаў (1949: 52), Агульнанямецкі Блек 27 мандатаў (1949: ніводнага), Нямецкая Партыя — 15 (1949: 17) і Цэнтр — 3 (1949: 10). Калі ўзяць пад увагу, што Вольная Дэмакратычная Партыя з 48 мандатамі і Нямецкая Партыя з 15 мандатамі твораць урадавую кааліцыю з хрысьціянскімі дэмакратамі, дык новы нямецкі ўрад, на чале якога найпраўдападабней будзе стаяць Адэнаўэр, будзе распараджацца ў парляманьце 307 галасамі на агульную колькасьць 487. Але гэтага яшчэ не хватае для зьмены канстытуцыі, для чаго патрэбна дзьве трэйція галасоў. Для гэтага не стае 17 галасоў. Гэтая бальшыня можа аднак быць здабытая, калі Агульнанямецкі Блёк з 27 мандатамі, які раней галасаваў за замежную палітыку Адэнаўэра і за нямецка-альянцкія дагаворы, у тым ліку й за ўдзел Нямеччыны ў эўрапэйскай армі, пры зьмене канстытуцыі падтрымае ўрадавую кааліцыю. Таксама хрысьціянскія дэмакраты надзеяцца, што Цэнтр (3 мандаты) прылучыцца да ўрадавай кааліцыі.

Такія вынікі нямецкіх выбараў — гэта балючая няўдача для Савецкага Саюзу. Не памаглі ані ягоныя перадвыбарныя тактычныя ходы, як абвешчаныя нядаўна палёгкі для Усходняй Нямеччыны і апошняя нота ў справе задзіночаньня Нямеччыны й падпісаньня зь ёй мірнага дагавору, ані цэлыя тысячы камуністычных агітатараў, нелегальна перакіданых з Усходняй Нямеччыны. Затое для палітыкі заходняй, перадусім для Амэрыкі, гэтыя выбары зьяўляюцца вялізарнай перамогай. Недарма заходняя прэса падчырквае, што цяпер справа рэалізацыі заходняэўрапэйскай аборонная супольнасьці зьяўляецца амаль што поўнай. Такія дзяржавы Заходняй Эўропы, як Францыя й Італія, парляманцкае жыцьцё якіх у вельмі вялікай меры спаралізаванае камуністымі й капітулянцкімі тэндэнцыямі сацыялістых, павінны Нямеччыне толькі пазайздросьціць. Сам-жа нямецкі народ у найбольш адказны мамэнт для вольнага сьвету, калі роля Заходняй Нямеччыны ў заходня-дэмакратычным блёку зьяўляецца выключна вялікай, паказаў ува ўсей паўніні свой палітычны розум.

Амэрыка унезалежніваецца

(Заканчэньне з 1-ай балоны)

намсі ў далёкаўсходніх справах, пачынае узыходзіць на шлях, які прапанаваў сэнатар Тэфт, г. зн. на шлях поўнага ўнезалежненьня сваёй замежнай палітыкі і ад Заходняй Эўропы і ад Задзіночаных Нацыяў.

Гэта ўжо выявілася ў зьмесьце падпісанага Амэрыкай абароннага пакту з Паўдзённай Карэяй і ў іншых заявах і запэўненьнях Задзіночаных Штатаў, зложаных у сувязі з карэйскім пытаньнем. Ня гледзячы на перапалох і абурэньне Заходняй Эўропы, Амэрыка заобавязалася, што яна пакіне мірную плітычную канфэрэнцыю ў справе Карэі ў выпадку, калі канфэрэнцыя гэтая на працягу 90 дзён еднага трываньня ня дасьць здавальняючых вынікаў. У далейшым Амэрыка асьведчыла, што ў выпадку новай агрэсіі ў Карэі яна будзе ставіць зорыны супрацу сама, не чакаючы на рэакцыю Задзіночаных Нацыяў.

Амэрыка цьвёрда заявіла й гэтую заяву паўтарае пры кажнай нагодзе, што яна не дапусьціць, каб камуністычны Кітай быў прыняты ў склад Задзіночаных Нацыяў. Супраць эвэнтуальнай пастановы за прыняцьцем чырвонага Кітаю яна мае зложыць у Радзе Бясьпечнасьці сваё вэто, а некаторыя адказныя амэрыканскія палітыкі, як, прыкладам, наступнік сэнатара Тэфта на становішчы рэспубліканскага правадыра ў сэнаце, сэнатар Ноўленд, пагражаюць, што ў выпадку прыняцьця камуністычнага Кітаю ў ЗН Амэрыка павінна апусьціць гэтую арганізацыю.

На маргінэсе варта адцеміць, што справа Кітаю можа ў заходнім лягеры выклікаць войстры крызыс. За прыняцьцем камуністычнага Кітаю будзе, як ведама, ламаць кап'ё Вялікабрытанія, за апошнім прыняцьцем апошнімі днямі высказаліся скандынаўскія дзяржавы, за гэта будуць напасьледак галасаваць і г. зв. «нэўтральныя» краіны на чале зь Індыяй. Адно, што можа паўстрымаць засьлепленых прыхільнікаў сяброўства Кітаю Мао-Тсэ-Тунга ў ЗН — гэта пагроза Амэрыкі выхаду з ЗН, што было-б роўназначным із самаліквідацыяй гэтай арганізацыі.

У справе бясьпечнасьці на Далёкім Усходзе Задзіночаныя Штаты наважаныя зрабіць усё, каб спыніць там усе акты камуністычнай агрэсіі й зрабіць іх немагчымымі ў будучыні. Пры гэтым, згодна з заявай прэзыдэнта Айзэнгаўэра, карэйскае пытаньне яны вяжаць і надалей з пытаньнем індакітайскім і ўсякай іншай тэрыторыяй, што зьяўляецца аб'ектам камуністычнай агрэсіі або загрожаная ёю. Каб дасягнуць гэтую мэту, Амэрыка наважаная весьці там палітыку цьвёрдае рукі, узноў-жа не аглядаючыся на сваіх саюзьнікаў з Задзіночаных Нацыяў. Гэта й было зьместам апошняй прамовы міністра замежных справаў ЗША Дальлеса, якую ён сказаў 2 верасьня перад Амэрыканскім Легіёнам, найвялікшай амэрыканскай камбатанцкай арганізацыяй.

Міністар Дальлес у гэтай прамове перасьцярог чырвоны Кітай перад магчымымі наступнымі актамі агрэсіі й ваеннай правакацыі. Міністар асьведчыў, што кажнае зорыйнае ўмяшаньне карэйскай народнай рэспублікі ў індакітайскую вайну пацягне за саобой «цяжкія для яе вынікі», якія, «могуць не абмежавацца толькі да Індакітаю». У выпадку-ж паўтарэньня камуністычнай агрэсіі ў Карэі «камуністыя не павінны лічыцца, што яны ў Манджурыі будуць мець і надалеі упрывілеяванае недатыкальнае заплечча». Такія перакананьні падзяляюць ужо шырокія колы амэрыканскага грамадзянства, у першую чаргу сфэры вайсковыя. Той-жа Амэрыканскі Легіён у сваёй рэзалюцыі выказаўся за прымяненьнем усіх амэрыканскіх ваенных сродкаў уключна з атамнай і вадароднай бомбаі у выпадку, калі палітычная канфэрэнцыя ў справе Карэі ня дасьць пажаданых вынікаў.

У гэтых заявах сказана ўжо многа. І сказана якраз тое, чаго найбольш панічна баіцца Заходняя Эўропа: расшырэньня вайны паза межы непасрэднага тэатру ваенных дзеяньняў, г. зн. паза межы Карэі ў выпадку новай камуністычнай агрэсіі на гэтай терытоыі, і паза межы Індакітаю ў выпадку, калі камуністычны Кітай вышле туды дывізіі сваіх «ахвотнікаў».

Гэтак прынятыя Амэрыкай забавязаньні й зробленыя афіцыяльныя асьведчаньні ў справе контракцыі супраць эвэнтуальнага ўзнаўленьня камуністычнай агрэсіі ў Карэі й пашырэньня гэтае агрэсіі ў Індакітаі паказваюць, што Амэрыка ў сваёй замежнай палітыцы пачала унезалежніваецца і ад Заходняй Эўропы і ад Задзіночаных Нацыяў. Усьведамляючы сваю адказнасьць за лёс вольнае часьці сьвету і свой уклад у ягоную абарону, Амэрыка ня хоча надалей вязаць сваёй ініцыятывы капітулянцкімі тэндэнцыямі эўрапэйскага Захаду, які дагэтуль вельмі мала спрычыняўся да супольнай абароннай акцыі перад камуністычнай загрозай, затое найчасьцей акцыю гэтую паралізаваў.

Ці такая пазыцыя Амэрыкі паглыбіць заснаваўшую трэшчыну між ёю й Заходняй Эўропай, чаго гэтак жадаюць бальшавікі, таварыць з усёй пэўнасьцю сяньня перадчасна. На нашую, аднак, думку, калі-б Амэрыка перастала зусім лічыцца з голасам Заходняй Эўропы ў сваёй палітыцы ў дачыненьні да камунізму, дык пазыцыя такая толькі прымусіла-б заходнія дзяржавы зьлезьці з двух крэслаў, на якіх яны сяньня сядзяць, а сесьці на адно. Сама Заходняя Эўропа адыграць ролі трэйцяе сілы ня здольная, а без амэрыканскае помачы абойдзіцца таксама ня зможа. Яна можа толькі, як і дагэтуль, тварыць апазыцыю ў заходнім лягеры супраць Амэрыкі так доўга, як доўга Амэрыка будзе з такой апазыцыяй лічыцца.

Таму апошнія сымптомы поўнага ўнезалежненьня амэрыканскай замежнай палітыкі трэба ўважаць за зьявішча пацяшаючае, калі Амэрыка ўзапраўды намераная вызваліцца ад вяжучых ейную ініцыятыву дэфэтызму й капітулянцтва ейных саюзьнікаў ды пайсьці сваім собскім шляхам. Гэта толькі зможа прысьпішыць перамогу Амэрыкі над камунізмам у халоднай вайне, адстрашыць апошняга ад спробаў распаленьня вайны гарачай, а ў выпадку справакаваньня яе — хутчэй і зь меншымі стратамі перамагчы і ў ёй.

Язэп Каранеўскі

Правал камуністычных плянаў у Пэрсіі

Былы пэрскі прэм'ер Мосадэк, які яшчэ нядаўна быў амаль што магутным дыктатарам Пэрсіі, сяньня апынуўся за кратамі й чакае на судовы працэс, як палітычны праступнік. Высунуўшыся на арэну міжнароднага жыцьця й спачатку замацаваўшы сваё становішча ў нутры краіны галоўна дзякуючы сваёй няўступлівай пазыцыі ў англа-пэрскім нафтавым канфлікце, хутка пасьля гэтага быў ён Захадам пакінуты, а ў собскай краіне апушчаны магутнай, нацыяналістычнай арганізацыяй «Змагарамі за іслям», на чале якой стаіць Кашані. У сувязі з гэтым пачаў ён што раз болей падпадаць пад уплывы афіцыяльна забароненай камуністычнай партыі «Тудэг», якая знаходзіцца на вернай службе Маскве. Гэтая партыя яшчэ ў 1952 г. памагла Мосадэку пераняць з рук шаха вярхоўнае камандаваньне арміяй, а вясной 1953 г. яна памагла яму апанаваць сытуацыю ў часе ведамых заварушэньняў у Тэгеране. Калі-ж нядаўна Мосадэк праводзіў у Пэрсіі плебісцыт у справе разьвязаньня парляманту, дык камуністыя далі яму звыш 70% галасоў.

Мэтаю камуністых было поўнасьцю адсунуць ад улады шаха, які, будучы выхаваным у заходняэўрапэйскай культуры, зьяўляецца энтузіястычным прыхільнікам Захаду і імкнецца завесьці ў краіне эўрапэйскую парлямэнтарную дэмакрацыю и правесьці шырокія сацыяльныя рэформы. Далейшаю мэтаю камуністых было — цераз перамогу Мосадэка над шахам — захапіць потым уладу ў свае рукі і абвесьціць у Пэрсіі «дэмакратычную рэспубліку» на узор ведамых бальшавіцкіх «народных дэмакрацыяў». Не дарма падчас рэвізіі, праведзенай пасьля ўпадку Мосадэка, была знойдзеная вялікая колькасьць ужо загадзя прыгатаваных новых пашпортовых марак з надпісам «Пэрская Рэспубліка».

Праўда, Мосадэку пры выдатнай дапамозе камуністых было ўдалося нядаўна правесьці дзяржаўны пераварот і выгнаць шаха, які быў змушаны ўцякаць у Рым. Але гэтай перамогай цешыўся Мосадэк роўна тры дні. Верны шаху пэрскі генэрал Сагэды пры помачы арміі, прыхільнай да шаха, правёў другі з чаргі дзяржаўны пераварот і ўмажлівіў шаху вярнуцца ў Тэгеран, дзе быў ён энтузіястычна прывітаны народам. Стаўшыся прэм'ерам Пэрсіі, ген. Сагэды правёў масавыя арышты сярод сяброў камуністычнай партыі «Тудэг» і ў краіне завёў поўны парадак.

Гэткім чынам Масква панесла вялікую няўдачу ў Пэрсіі. Ёны пасол у Тэгеране Анатоль Лаўрэньцьеў, які «раптоўна захварэў», з прычыны няўдачы правядзеньня захапленьня камуністымі ўлады, як прыпушчае пэрская й заходняя прэса, быў адкліканы ў Маскву і, каб унікнуць суровага пакараньня, прабаваў пакончыць самагуоствам.

Пэрсія ўвайшла цяпер у арбіту палітыкі Захаду. Амэрыка пастанавіла прыйсьці ёй з матарыяльнай помаччу. Як паведамляюць урадавыя колы з Тэгерану, яшчэ ў гэтым месяцы маюць быць узноўленыя англа-пэрскія перагаворы ў справе эксплятацыі пэрскае нафты.

(-іч)

Канец ці перапынак?

(Заканчэньне зь 1-ай балоны)

нямі прадстаўнікоў нерасейскіх народаў ды групы расейскіх «дэмакратаў» тыпу Керэнскага-Мальгунова. Ня менш наглядна Амерыканцы маглі пераканацца, хто ўзапраўды быў прычынай няўдачы ў стварэньні шырокага антыбальшавіцкага фронту.

Як мы даведаліся, у канцы жніўня прадстаўнікі Парыскага Блёку атрымалі тэлеграму ад адмірала Стывэнса, у якой ён дзякуе гэтаму Блёку за ўсе высілкі і трохмесячную працу канфэрэнцыі ды просіць не парываць кантакту з Амэрыканскім Камітэтам. Ён паведамляе, што Амэрыканські Камітэт будзе шукаць іншага выхаду дзеля стварэньня антыбальшавіцкага міжнацыянальнага цэнтру і ў гэтых ягоных намаганьнях запрашае да супрацоўніцтва Парыскі Блёк.

Мюнхэнская канфэрэнцыя Парыскага Блёку мела й яшчэ іншыя, можа навет найважнейшыя, пазытыўныя вынікі. Праўда, міжнацыянальны цэнтр антыбальшавіцкага змаганьня, які меўся быць створаны, астаўся яшчэ не завершаны. Але затое Парыскі Блёк стаўся яшчэ больш сцэмэнтаваным і выпрабаваным. Ён зьяўляецца моцным і аўтарытэтным міжнацыянальным цэнтрам нерасейскіх народаў Савецкага Саюзу, зложаным з найбольш рэпрэзэнтатыўных і правамоцных іхных нацыянальных прадстаўніцтваў на эміграцыі. І ў той час, калі перад гэтым кажная эміграцыя з падсавецкага Ўсходу выступала перад заходнім сьветам асобна й нескаардынавана з эміграцыямі іншых народаў, дык цяпер усе яны маюць магчымасьць бараніць свае нацыянальныя інтарэсы супольным скаардынаваным фронтам. Няма патрэбы й даказваць, што эфэкт такой задзіночанай акцыі будзе без параўнаньня мацнейшы, а вынікі большыя. Таму, ня гледзячы навет на тое, што не ўдалося яшчэ навязаць супрацоўніцтва з Амэрыканскім Камітэтам ня зь віны Парыскага Блёку, сама-ж акцыя гэтага Блёку ўкаранавалася вялікімі пасьпехамі.

БЕЛАРУСЫ!

ВЫПІСВАЙЦЕ, ЧЫТАЙЦЕ Й ПАШЫРАЙЦЕ АДЗІНУЮ БЕЛАРУСКУЮ ТЫДНЁВУЮ ГАЗЭТУ НА ЭМІГРАЦЫІ «БАЦЬКАЎШЧЫНУ»!

Лукаш Калюга 2

Лукаш Калюга й ягоная „Нядоля Заблоцкіх"

(ДА ПЕРАДРУКУ ТВОРУ У «БАЦЬКАЎШЧЫНЕ»))

(Працяг)

Заблоцкі — шырака ведамае прозьвішча анэкдотычнага гэроя прыказкі: «Зарабіў, як Заблоцкі на мыле» — прыказкі, як кажуць, шырака ведамай ня толькі ў нас, а і па цэлай заходняй Славяншчыне (прынамся Ўладзімер Жылка цьвердзіў, што прыказка гэтая знаная навет Чэхам). Анэкдот, выснаў якога становіць гэтая прыказка, кажа пра нейкага камэрсанта Заблоцкага, які надумаў зарабіць на мыле, правозячы яго праз мора кантрабандаю, без аплаты мытных падаткаў, дзеля чаго ён загадаў схаваць свой тавар ад вока мытных агентаў, падвязаўшы яго пад дном карабля. Мыла, пэўна-ж, растала ў моры, і гэтак вось і «зарабіў» на ім Заблоцкі, стаўшыся прыказачным сымбалем дзялка (або й «дзеяча»), што выбіраючы ня просты шлях «абходу», «круту-муту», «зарабляе» на ім, трацячы ўсё.

Хоць прыказка й анэкдот падаюць «заблоччыну» ў чыстакамічным разрэзе, пры глыбейшым падыходзе адчыняецца й магчымасьць трагі-камічнае інтэрпрэтацыі яе. То-ж бо вельмі добра кажа другая нашая народная прыказка: «камэдыя, хто ня ведае, а як хто ведае, дык і няма ніякай камэдыі», г. зн. камічнае, пры глыбейшым веданьні ці зьведаньні яго, часта абарочваецца трагічным і таму ў існасьці становіць сабою трагі-камічнае. А ці-ж не трагі-камічнымі ў сваёй існасьці й выніках аказваліся й тыя, так блізкія да «заблоччыны» шляхі і таго чаканьня, і «сну», і лятуценьняў, і «зноскаўшчыны» — то-ж бо якраз з гэтага боку паказаў некаторыя зь іх (асабліва апошнюю) ў «трагічна-сьмяшгівых сцэнах» сваіх «Тутэйшых» Янка Купала...

Хоць нашая літаратура, як ужо казалася, і не чапала «заблоччыны» (да Калюгі), але ў такім блізкім да яе нашым нацыянальным руху праявы гэтага парадку маглі назірацца ўжо ці цепярся... Як кажа (між іншага, хоць і ня вельмі ўжо глуха) В. Ластоўскі ў сваіх успамінах пра М. Багдановіча, у г. зв. «верхняй палаце» «Нашае Нівы», што ня толькі прэтэндавала, а й фактычна адыгрывала ролю галоўкі кіраўнічага штабу нацыянальнага руху, ужо ня цураліся паставіць на службу гэтаму руху і магчымасьці «крутам-мутам»...! Далейшая-ж гісторыя руху, асабліва ў рэвалюцыйных і парэвалюцыйных часох (ад 1917 г. і праз дваццатыя гады асабліва) знае ці мала выпадкаў спробаў выкарыстаньня падобных магчымасьцяў, аб якіх няма тут асаблівага сэнсу вельмі распраўляць. Для нашага выпадку досыць будзе спыніцца на сказаным былым прэм'ерам ураду БНР, Аляксандрам Цьвікевічам, пасьля таго, як ён, «зьліквідаваўшы» гэты ўрад на г. зв. «Бэрлінскай канфэрэнцыі» ў савецкі Менск: «Калі нельга правесьці трэба старацца правесьці яе ў вабход» (і балонах савецкага часапісу «Полымя» — «нахабна сказана», як згрызаліся пасьля самі бальшавікі...). У сваім-жа практычным і фактычным прытарнаваньні Цьвікевічава формула й абарочвалася нічым іншым, як чысьцюткай «заблоччынай» — спробай правезьці ў вабход савецкіх мытнікаў кантрабанду (так і называлі гэта заўсёды самі бальшавікі) нацыянальнае ідэі й дзеі пад дном г. зв. «нацыянальнае формы» савецкага карабля, дзе ідэю й дзею гэную толькі й магла спаткаць (дый спаткала!) доля прыказачнага мыла Заблоцкага. Адылі, Цьвікевіч адно шчыра («нахабна») сфармуляваў прынцып, на якім ужо задоўга перад тым заснаваўся і нат да пары-да часу праспэраваў рух беларускага нацыянал-камунізму на чале з З. Жылуновічам — Ц. Гартным, У. Ігнатоўскім, А. Чарвяковам ды інш.

Пад 1928 год «заблоччына» беларускага нацыянал-камунізму ды розных іншых прыхільнікаў тае-ж тактыкі сталася ўжо даволі выразнай у сваіх перспэктывах кажнаму, хто меў вочы бачыць... У канцы 1928 году і зьявілася ўспамінаная ўжо намі паэма У. Дубоўкі «Урачыстая дата», фармальна прысьвечаная адзначанаму тады дзесяцігодзьдзю БССР. Тутака ўзвышэнскі паэта з нагоды юбілею г. зв. «беларускай савецкай дзяржаўнасьці» даваў войстра-крытычны агляд папярэдняе гісторыі нашага нацыянальнага руху, якая ў ваччу шмат каго на той час і ўкаранавалася гэнай «дзяржаўнасьцяй». У першым разьдзеле паэмы, пад характэрным загалоўкам: «У пачатку было слова, і на слове слова і пад словам слова», Дубоўка сатырычна забразоўвае наш дарэвалюцыйны нацыянальны рух зь ягоным прымітыўна-наіўным народалюбствам, часта ў бяскрытычным перайманьні расейскае традыцыйнае тэрміналёгіі званым «народніцтвам» («вельмі любілі народ і зь верашчакай бліны»), а галоўна — з расплывістай нацыянальнай фразэалёгічнасьцяй (тым, што Купала ў «Тутэйшых», хоць і яшчэ даволі асьцярожна, паказаў у «здольніцтве») пры ўхіленьні ад канкрэтнае й наважанае дзейнасьці запраўднага й рэальнага правадырства нацыі: «Хтосьці кудысьці ішоў некага нехта зваў. Слоў — было многа слоў, дзеі ніхто ня знаў»... Вось чаму, як нядвузначна паказвае паэта ў другім разьдзеле, і адбыўся перахоп ініцыятывы й кіраўніцтва нацыянальнага руху бальшавікамі — «справа прыйшла зьлева», хоць пры гэтым «былі памылкі і разгоны, хапала крыўды і абраз», як не баіцца паэта выткнуць перахопнікам нат у іхны юбілейны дзень, выразна ківаючы пры гэтым і на тыя гвалты, з найбольшым між іх — разгонам Усебеларускага Кангрэсу, якіх дапусьціліся яны, ня вельмі аднак (асабліва тэй парою) любячы ўспамінаць пра іх... Пасьля гэтага Дубоўка спыняе сваю адмысловую ўвагу на тых нацыянальных дзеячох, што пры іхнай памозе й правялі бальшавікі гэны перахоп ініцыятывы й кіраўніцтва руху — на беларускіх нацыянал-камуністых у васобе самога іхнага гістарычнага бацькі З. Жылуновіча-Ц. Гартнага, які якраз гэным часам пачынаў даставаць запраўдную заплату ад тых, каму служыў і прыслужваўся, абвінавачаны імі ў розных «ухілах» і «наскоках». Вось так і скончылася справа, калі казаць ясьней — ухілы. «Ён робіць так наскокі справа, за ім Заблоцкі носіць мыла» — гэтак на канчатку сатырычна канстатуе Дубоўка ўжо з поўнай яснасьцяй абазначаныя запраўдныя вынікі дзейнасьці Жылуновіча і ад пачатку духова ачольваных ім беларускіх нацыянал-камуністых.

Успамінаньне Дубоўкам «Заблоцкага», як і часта ў зьядлівай сатыры гэтага паэты, цаляла ў колькі, як кажуць, «зайцаў» (між іншага й дарэчы, якраз у вобразе «зайца» і выводзіўся сам Жылуновіч у паэме). Найперш дзякуючы гульні гукаў, кажнаму прыгадваўся тут Глыбоцкі (іначай — Дудар), адзін з найвярнейшых збраяноша Жылуновіча пры ягоных «ухілах» і «наскоках», разам зь ім і расьпяканы цяпер гаспадарамі... У сувязі з гэтым і самы вобраз «мыла» ўспрыймаўся ня толькі ў разрэзе анэкдоту пра «заработак» на ім, але і ў сьвятле хадзячага выразу пра «імкненьне лезьці бяз мыла»... але праз гэтыя канкрэтныя мішэні Жылуновіча й Глыбоцкага, бачылі добра ўсе, уражаўся сам нацыянал-камунізм як такі, зь ягонаю, гэтак хітра-мудра, «пазаблоцку», казаў той, задуманаю, а так непераборліва запраўды «бяз мыла» праводжанаю тактыкаю «калі ня ў лоб, дык у вабход», тактыкаю, што ўжо відавочна пачынала й аплачваць сябе «пазаблоцку»-ж. Гэткае трапнае і зьместам і формаю выкрыцьцё беларускага нацыянал-камунізму Дубоўкам запрашала ня толькі пасьмяяцца каля дасьціпнае й зьядлівае гульні словаў, але й задумацца над сэнсам іх, над усім сэнсам абазначанае тут імі гістарычнае праявы. Лукаша-ж Калюгу яно й навяло на думку заняцца гэтаю праявай «заблоччыны», як аднае з формаў калі ня «боскае», дык «людзкое камэдыі» народу, тае прыказачнае «камэдыі, калі хто ня ведае», што ў зьведанай існасьці сваёй абарочвалася адным із мамэнтаў усяе вялікае трагэдыі народнай. Гэтак і паўстала ідэя «Нядолі Заблоцкіх».

(Далей будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Хто паносіць адказнасьць?

АБ НЯЎДАЧЫ СТВАРЭНЬНЯ ЗАПРАЎДНАГА АНТЫБАЛЬШАВІЦКАГА КААРДЫНАЦЫЙНАГА ЦЭНТРУ

Амэрыканскі Камітэт Вызваленьня ад Бальшавізму 27 жнівеня сёлета выдаў у Нью Ёрку прэсавы Камунікат, у якім паведамляе аб спыненьні матарыяльнай і ўсякай іншай помачы для расшчэпленага КЦАБ-у, аб адмове вызнаньня МАКЦ-у і аб тым, пад якімі ўмовамі гэтая помач можа быць даваная для антыбальшавіцкай дзейнасьці эміграцыяў з Савецкага Саюзу. З гледзішча на тое, што Камунікат прэцызуе палітычнае становішча Амэрыканскага Камітэту ў дачыненьні да паняволеных народаў, як і выясьняе ягоны пагляд на сутнасьць былага КЦАБ-у, заслугоўае ён на шырэйшую ўвагу.

Мы ня ведаем, ці некаторыя сфармуляваньні гэтага Камунікату зьвўляюцца тонкім дыпляматычным абыходам дзеля схаваньня собскай віны Камітэту, што не дайшло да стварэньня жаданага ім супольнага антыбальшавіцкага каардынацыйнага цэнтру, ці выражаюць яны запраўдную пазыцыю Камітэту ў дачыненьні да гэтага пытаньня. Калі маем дачыненьне з гэтай другой эвэнтуальнасьцю, тады мусім згары сьцьвердзіць, што звыш двухгодняя, у сваей аснове няправільная, палітыка Амэрыканскага Камітэту ў дачыненьні да паняволеных народаў, якая, ня гледзячы на вялікія натугі й мільёны змарнаваных даляраў, кончылася поўным фіяскам, нічога Амэрыканскі Камітэт не навучыла. Паміма ўсяго, нам цяжка паверыць, што ўспомненыя сфармуляваньні выражаюць сяньняшнае становішча Амэрыканскага Камітэту. Таму мы зьяўляемся сьхільнымі ўважаць, што яны зьяўляюцца толькі тактычным самаапраўданьнем за ўсе дасюлешнія няўдачы. Але пяройдзем да самога Камунікату.

На пачатку ў ім гаворыцца: **«На працягу больш чымся двух год Камітэт цярпліва заахвочваў** (у расейскім тэксьце Камунікату, якім паслугоўваемся, сказана — «поощрял» — А. К.) **перагаворы паміж найбольш адказнымі й рэпрэзэнтацыйнымі палітычнымі групамі, як расейскімі, гэтак і нерасейскімі, у спробе дасягнуць пагадненьне па раду прынцыпаў, якое дазволіла-б ім супрацоўнічаць аднэй з другой і з Камітэтам у антыбальшавіцкай рабоце. У ходзе абмеркаваньняў і нарадаў быў дасягнуты вельмі істотны прагрэс у справе пагадненьня супярэчных пунктаў гледжаньня і ў вапрацаваньні асновы для супрацоўніцтва».** Далей гаворыцца аб створаным у кастрычніку 1952 году КЦАБ-е, якому Камітэт аказаў сваё падтрыманьне, а значыцца вызнаў яго за дастаткова рэпрэзэнтатыўны й запраўдны каардынацыйны цэнтр антыбальшавіцкага змаганьня і толькі, як гаворыцца ў Камунікаце, **«выразіў надзею, што будуць прынятыя новыя групы, каб ён (Цэнтр) стаўся больш рэпрэзэнтатыўным органам эміграцыі».**

Прыпомнім, як узапраўды адбываўся працэс мантаваньня гэнага цэнтру, які спачатку меў называцца СОНР-ам, а напасьледак атрымаў імя КЦАБ-у. Восьжа калі расейскае слова «поощрял» можна пералажыць на беларускую мову словам «заахвочваў» або навет «паддзержываў», дык у запраўднасьці было інакш. Амэрыканскі Камітэт куды больш заангажаваўся ў акцыю стварэньня КЦАБ-у ў тэй ягонай форме й пры тэй ягонай палітычнай праграме, якую адлюстроўваў статут КЦАБ-у: Амэрыканскі Камітэт ня толькі «заахвочваў» ці «паддзержываў» стварэньне такога КЦАБ-у, якім ён быў, але навет усю гэтую акцыю рэжысараваў і потым яе беззасьцярожна заапрабаваў навет пры адсутнасьці ў КЦАБ-е наймацнейшых, пасьля Расейцаў, нацыянальных групаў — Беларусаў і Украінцаў. Таму за КЦАБ, які не апраўдаў пакладаных у ім надзеяў, нясе найбольшую адказнасьць сам Амэрыканскі Камітэт. Агульныя асновы статуту недакончанага СОНР-у, а пазьней КЦАБ-у, зь ягонай арганізацыйнай структурай і палітычнай пляцформай у нацыянальным пытаньні былі апрацаваныя й прынятыя аднымі расейскімі арганізацыямі яшчэ на Штутгарцкай канфэрэнцыі і заапрабаваныя Амэрыканскім Камітэтам ня гледзячы на тое, што да апрацаваньня гэтых статутовых асноваў будучага міжнацыянальнага цэнтру ніводная нерасейская арганізацыя ані група ня была навет запрошаная. Гэтыя асновы й прынцыпы былі ўжо потым — на Вісбадэнскай, Штарнбэрскай ды Мюнхэнскай канфэрэнцыі прадстаўленыя ўжо ў гатовай форме тым нерасейскім арганізацыям, якія выразілі згоду прыступіць да гэнага каардынацыйнага цэнтру. У ходзе далейшых перагавораў былі ўведзеныя на станоўчае дамаганьне нерасейскіх арганізацыяў усяго толькі дрооныя й мала істотныя зьмены ў падгатаваную Расейцамі пляцформу, галоўныя асновы якой, на катэгарычнае і ультыматыўнае дамаганьне Расейцаў, ды пры выразным падтрыманьні іх у гэтым Амэрыканскага Камітэту, аднак, асталіся. І калі ў кастрычніку 1952 году быў падпісаны на Мюнхэнскай канфэрэнцыі гэткі статут КЦАБ-у, дык некаторыя нерасейскія арганізацыі, як грузінская, паўночна-каўкаская, азэрбайджанская й туркестанская (не ўспамінаем армянскай групы сп. Сааруні, як выразна дывэрсійнай), ня бачучы іншага выхаду, згадзіліся з гэтым статутам у надзеі, што й пры такім статуце Расейцы выкажуць прынамсі мінімум добрае волі, што супольнае супрацоўніцтва будзе магчымым. Беларуская-ж група, пайменна Беларускі Антыбальшавіцкі Фронт, які ад Штарнбэрскай канфэрэнцыі прыймаў удзел у перагаворах, але ў гэтае мінімум добрае волі расейскіх адзінанедзялімцаў не паверыў, статуту гэтага не падпісаў і да супрацоўніцтва ня прыступіў.

Такім чынам ня **«ў ходзе абмеркаваньняў і нарадаў быў дасягнуты істотны прагрэс у справе пагаджэньня супярэчных пунктаў гледжаньня і ў выпрацаваньні асновы для супрацоўніцтва»,** як гаворыцца ў Камунікаце, але тыя нерасейскія арганізацыі, што прыступілі да КЦАБ-у, прынялі зь некаторымі — падчыркваем — **дробнымі й мала істотнымі зьменамі,** выпрацаваныя выключна Расейцамі «асновы для супрацоўніцтва», супярэчныя з жыцьцёвымі нацыянальнымі інтарэсамі нерасейскіх народаў, у надзеі, што за кошт вялікіх уступак удасца знайсьці магчымасьць супольнага з Расейцамі супрацоўніцтва. Калі-ж у працэсе пазьнейшай практычнай дзейнасьці пераканаліся, што такое супрацоўніцтва ня зь іхнае віны зусім немагчымае, не знайшлі іншага выхаду, як пакінуць КЦАБ. Найлепшым доказам таго, што зацьверджаны Амэрыканскім Камітэтам статут КЦАБ-у аказаўся ў практычнай дзейнасьці зусім няпрыгодным, бо даваў шырокія магчымасьці выкарыстоўваць яго расейскім рэакцыйным шавіністычным колам для іхнай адзінанедзялімаўскай імпэрыялістычнай палітыкі, а не для запраўднага змаганьня з бальшавізмам, была адмова ад гэтага статуту і прагрэсыўных расейскіх групаў — Лігі Нікалаеўскага і бальшыні СБОНР-у.

Далей у Камунікаце чытаем: Ён (Амэрыканскі Камітэт — А. К.) **уважае, што пытаньне аб будучай структуры й дзяржаўным ладзе тэрыторыяў, цяпер складаючых Савецкі Саюз, можа быць разьвязанае толькі жыхарамі гэтых тэрыторыяў пасьля таго, калі яны ўзноў здабудуць свабоду выбару ,а таму ён адмаўляецца узяць на сябе забавязаньне паддзержываць разьвязаньні гэтага пытаньня, прапанаваныя якой-небудзь асобнай групай або часткай эміграцыі».** Тут мова аб г. зв. «непрадрашэнстве».

З асаблівым націскам мусім адцеміць, што Амэрыканські Камітэт, фармальна паддзержваючы прынцып «непрадрашэнства», ці то пад уплывам расейскіх імпэрыялістычных арганізацыяў, ці то прарасейскіх колаў у самым Амэрыканскім Камітэце, — на нашую думку пад уплывам адных і другіх — фактычна стаў на пазыцыях «прадрашэнства». Доказам гэтага зацьверджаны ім статут КЦАБ-у. Гэтым прадрашэнствам ёсьць прыняцьце ў статуце прынцыпаў Люнтаўскай рэвалюцыі, як выхаднога пункту да пасьлядоўнага пераходу да народаўладзьдзя пасьля эвэнтуальнага зьнішчэньня бальшавізму і паварот да агульнарасейскай, хоць і часовай, на ўсей тэрыторыі Савецкага Саюзу дзяржаўнай формы, у рамах якой прадугледжвалася правядзеньне агульнанароднага волявыяўленьня ў той час, калі запраўднаму непрадрашэнскаму прынцыпу найлепш адказвала-б часовае захаваньне існуючых фармальна і фактам сяброўства Беларусі і Украінны ў Задзіночаных Нацыях вызнаных юрыдычна Захадам саюзных рэспублікаў Савецкага Саюзу і ў рамах гэтых рэспублікаў правядзеньне агульнанароднага волявыяўленьня. Тут навет не гаворым аб тым, што найлепшай формай непрадрашэнства было-б вызнаньне аовешчаных і створаных нерасейскімі народамі сваіх незалежных дзяржаваў у пэрыяд 1917—1918 году.

Далей у Камунікаце сказана: **«Ён** (г. зн. Амэрыканскі Камітэт — А. К.) **настойваў, што ніводная эміграцкая партыя або група не павінна мець дамінацыі** (у арыгінале сказана — «господства» — А. К.) **ў кіраўніцтве тэй дзейнасьцю, якой Камітэт аказвае сваё падтрыманьне».**

Зусім правільна! Але ці-ж славуты «парытэт» у статуце былага КЦАБ-у, які палавіну месцаў і галасоў аддаваў Расейцам, а другую палавіну нерасейцам, усім разам узятым, ды практычная дзейнасьць КЦАБ-у ня была поўнай дамінацыяй Расейцаў у гэтай арганізацыі?

Пры гэтым адно спраставаньне: у Камунікаце сказана, што **«ў пачатку чэрвеня 1953 году, у той мамэнт, калі вяліся перагаворы ў справе прыняцьця ў цэнтр некалькіх значных нацыянальных арганізацыяў, Карадынацыйны Цэнтр расшчапіўся на дзьве варожыя групоўкі...»** Неабходна выясьніць, што гэтых «некалькіх значных нацыянальных арганізацыяў», г. зн. арганізацыі Парыскага Блёку ня мелі найменшага намеру прылучэньня да існуючага каардынацыйнага цэнтру, г. зн. КЦАБ-у, але імкнуліся стварыць зусім новы, запраўдны й аўтарытэтны каардынацыйны цэнтр.

З вышэй прыведзеных сфармуляваньняў Камунікату Амэрыканскі Камітэт робіць наступны вывад: **«Няздольнасьць эміграцыі задзіночыцца ў гэтай крытычнай абстаноўцы можа толькі садзейнічаць намаганьням Крэмля пасеіць церці й разлад у радох эміграцыі і ня даць ёй іграць тэй ролі ў змаганьні за вызваленьне ад бальшавізму, на якую яна здольная і для якой у яе ёсьць адзіныя ў сваім родзе дадзеныя».**

Гэтыя суровыя абвінавачаньні паводля нашага цьвёрдага перакананьня кінутыя Амэрыканскім Камітэтам не па адрасу. Ня віна ўзапраўды дэмакратычных арганізацыяў як нерасейскіх, гэтак і расейскіх, што антыдэмакратычныя колы расейскай шавіністычнай рэакцыі тыпу Мельгунова, Керэнскага й напоў фашыстоўскага НТС згаджаюцца ісьці супольным фронтам выключна пад умовай дамінацыі ў гэтым фроньце Расейцаў ды пад умовай павароту да адзінай і недзялімай, хоць фармальна і часовай, расейскай імпэрыі. І ня віна гэтых арганізацыяў, што Амэрыканскі Камітэт у сваей дасюлешняй дзейнасьці такую антыдэмакратычную канцэпцыю расейскае імпэрялістычнае рэакцыі падтрымліваў і акцэптаваў. Сам-жа факт развалу КЦАБ-у й ягоная ліквідацыя Амэрыканскім Камітэтам — гэта бясспрэчны доказ поўнага банкротства дасюлешняй палітыкі Амэрыканскага Камітэту, да чаго апошняму ня выпадае прызнацца.

Камунікат канчаецца наступнымі славамі: **«Калі цяперашнія групоўкі змогуць дасягнуць пагадненьне аб задзіночаньні сілаў у антыбальшавіцкім змаганьні, Камітэт узновіць сваё матарыяльнае падтрыманьне. Ён гатоў супрацоўнічаць з палітычнымі групамі эміграцыі, але толькі на аснове ўзаемнага супрацоўніцтва».** У вапошніх словах «на аснове ўзаемнага супрацоўніцтва» мы разумеем супрацоўніцтва ня толькі між Амэрыканскім Камітэтам і гэтымі арганізацыямі, але адошніх між сабою.

Вось-жа калі ад гэтакіх перадумоваў узалежнівае Амэрыканскі Камітэт сваю помач, дык можа спакойна «поощрять» перагаворы між гэтымі групамі ў бесканечнасьць і можа быць згары пэўным, што нічога з гэтага ня выйдзе. Бо нельга-ж прыцягнуць да супольнага антыбальшавіцкага змаганьня пры пашанаваньні істотных нацыянальных правоў нерасейскіх народаў тых расейскіх групаў, у перакананьні якіх гэтае антыбальшавіцкае змаганьне павінна быць безаглядна падпарадкаванае змаганьню за рэстаўрацыю адзінай непадзельнай новай расейскай турмы народаў. Нельга-ж бачыць няпрымірлівага антыбальшавіка ў васобе Керэнскага, які яшчэ некалькі год таму назад, гаворачы аб Сталіне, меў адвагу асьветчыць, што **«лепей благі дыктатар, чымся рваць на кускі жывое цела Расеі».**

Ня гледзячы на такія сфармуляваньні вышэй прааналізаванага Камунікату, Амэрыканскі Камітэт апошнім часам усё-ж такі прайшоў значную эвалюцыю ў дачыненьні да нацыянальных праблемаў нерасейскіх народаў і выказаў некаторае зразуменьне іхных жыцьцёвых нацыянальных імкненьняў. Найлепшым гэтага доказам была ўспомненая ўжо ліквідацыя ім КЦАБ-у і ягоныя, ня рэдка рэчовыя, дачыненьні да Парыскага Блёку. Адмірал Стывэнс у сваей апошняй тэлеграме да Парыскага Блёку заявіў, што Амэрыканскі Камітэт будзе яшчэ шукаць новых спосабаў і формаў стварэньня запраўднага антыбальшавіцкага каардынацыйнага цэнтру. Гэтыя намаганьні Амэрыканскага Камітэту мы шчыра вітаем. І выражаем сваю ўпэўненасьць, што гэтыя формы будуць хутка знойдзеныя, калі ён сам праявіць добрую волю і ўзыйдзе на аб'ектыўны шлях роўнага пашанаваньня нацыянальных інтарэсаў і імкненьняў як нерасейскіх народаў СССР, гэтак і народу расейскага.

Алесь Крыга

Аб „непрадрашэнстве", траянскім каню і бабскай спадніцы

ФЭЛЬЕТОН

Ня дай Бог быць доктарам, а разам — прафэсарам ды яшчэ інжынерам! Каб я меў дыплёмы — навет самыя праўдзівыя, падраў-бы іх на кавалачкі ды і кінуў у печку. Гэтулькі праблемаў! Напрыклад, вось я цяпер не знаходжу супакою, што-ж такое, напасьледак, «непрадрашэнства»? А ў спакою, і толькі ў ім — шчасьце! Мне заўсёды здаецца, што «непрадрашэнства», калі такое ёсьць у натуры, шчыльна зьвязана з бабскай спадніцай (ёсьць спадніцы і ня бабскія, прыкладам, у школкіх ваякаў). Каб маіх заўвагаў ня прыймалі чытачы з ухмылкай, прывяду факты: малым хлапчуком я дужа баяўся гусакоў. Бывала, ідзем з маткай, а тут, раптам, гусак з выцягнутай шыяй і з злосным шыпеньнем. Я тады — за матчыну спадніцу! Магу сказаць ,што я ў той час быў стапроцантавым «непрадрашэнцам», бо ніколі не адважваўся спаткаць небясьпеку так, як гэта належыць больш адважнаму і больш спрытнаму хлапчуку. Лепш схавацца за спадніцу!

А вось факты й гістарычныя (ня гістэрычныя, а гістарычныя!). У Расеі ў 1917 годзе ўзьнік часовы ўрад... Але, для яснасьці, мушу тут зрабіць невялікае адступленьне. Гэты край напамінаў тады дом, у якім раптам выбухнуў пажар. Што заставалася рабіць? Паадчыняць вокны, дзьверы, каб даць магчымасьць ратавацца й тушыць пажар. Тымчасам нехта іх трымаў запёртымі з тае прычыны, што справа гэтая парушала спакой жыхароў...

Гэтак і з расейскім часовым урадам. Людзкасьць у 1917 годзе патрабавала хлеба, сацыяльных рэформаў, нацыянальнай волі, зямлі, а часовы ўрад адказаў: «Ня вырашаем! Пачакайце! Не настаў яшчэ час! Гэта разаб'е Расею на кавалачкі...» Толькі адно пытаньне было вырашана: «вайна да пераможнага канца!»... Што з гэтага выйшла, усякі ведае. Я толькі дадам, што прэм'еру гэтага «непрадрашэнскага» ўраду засталося адно падхварбаваць бровы і вусны на манер нявытрыманай інстытуткі, надзець бабскую спадніцу і ўцякаць. Расея-ж палезла па ўсіх швох...

Віну за гэта расейскія дзейнікі складалі — і цяпер яшчэ складаюць — на плямбаваны вагон. Вышэйшыя нямецкія сфэры, каб зламаць Расею ў вайне, маўляў, пасадзілі ў вагон Леніна, Каменева і іншых і пусьцілі іх па рэйках у Расею. Добра падумаўшы, я можа й пагаджаюся зь імі. Калі, скажам, паводля Гомэра, вялікая траянская вайна скончылася пры дапамозе аднаго «каня», дык чаму другая сусьветная не магла скончыцца пры дапамозе плямбаванага вагону? Зразумела, першабытныя траянцы ня мелі яшчэ вагонаў, таму зрабілі каня, каб паслаць у ім у тыл ворага сваіх лазутчыкаў, цывілізаваныя Немцы выкарысталі для гэтае мэты вагон. Праўда, Ленін жартаваў пазьней з часовага ўраду:

— Уладу мы падабралі на вуліцы!..

Так ці іначай, але факт застаецца фактам, што ўсякае «непрадрашэнства» зьвязанае з бабскай спадніцай...

Доктар, прафэсар і інжынер
Казік Апенка

ЛУКАШ КАЛЮГА

Нядоля Заблоцкіх

2)

ЧАСТКА ПЕРАДПЕРШАЯ

Тахвілін Швагер

(Працяг)

БЛАГІЯ ВОЧЫ

Нашы баркаўчане і ганяць і шкадуюць Тахвілю.

— Можа, — кажуць — і сама яна гэтаму ня рада. Што-ж калі яе гэтакія вочы: на што гляне, дык пашкодзіць.

— Але, пане ты мой, пашкодзіць! Ды 'шчэ як пашкодзіць!

Хто чужы, таму па Тахвілі малы клопат: узгаворацца пра яе, бядаваць паможа, а кінулі гаварыць, дык і забудзецца. От ужо Юстапу — накшая рэч: ён-жа шваграм Тахвілі прыходзіцца — сякі такі сваяк лічыцца. Ня раз Юстап казаў сваёй Прузыне, каб пасварылася на сястру.

— Скажы ты ёй, хай гэтакая разумная ня будзе, ато некалі людзі ўсёроўна прытаўкуць за благія вочы, хай пераставіць сябе, пакуль ціха.

Прузына лепей за Юстапа ведае Тахвілю. Ён толькі тое пляце, што ад людзей чуць давялося, а яна-ж гадавалася ў ваднэй хаце. Прузыне от злосьць за сваю нічога невінаватую сястру.

— А сьціхні ты! — асыкнецца бывала яна на Юстапа. — Дурні здумалі, плятуць няма ведама што; а ён ім і веры дае.

— Ды цябе сем сабак ня перабрэша, а ня то каб я адзін. Аднаго заводу з Тахвіляю. Чорт за д'ябла цягне.

— Ат! Гавары з п'яным пацеры. Ты сваё, а ён сваё.

Прузына да Тахвіліных вачэй прызыкла. Яны ёй і ня страшныя былі, дарма што — цёмныя, троха ня зусім чорныя. Ды й праўда! Ці мала на сьвеце ёсьць людзей зь цёмнымі вачыма? І ніхто ім па гэтым ганьбы не дае. Ня было-б па адных вачох і на Тахвілю такой напасьці, каб яна хоць крыху сама сябе глядзела. Ато, мусіць, у год раз ці й таго меней мылася, дык хадзіла чорная, як цыганка. (А можа тут і ня мыцьцё вінна? Можа яна была твару такога? Хто яго ведае!). Ды сама, як сама, але ўсё на ёй каравае было — як хустка на галаве, так і ніжэй усякая адзежына ламалася ад гразі. Ды, раздумаўшыся, ня было Тахвілі дзеля чаго (ці то праўда, — дзеля каго) надта строіцца, вымывацца, вычэсвацца. Як я знаў, зьвякавала яна пры брату, сватоў ніадкуль не чакала, дык от — як дзень пражыў, так і добра.

Яшчэ замаладу пра Тахвілю благая слава па людзях пашла. Але к гэнай славе надта ня прыслухоўваліся, як Тахвілін бацька пахваліўся, што дасьць ёй восемдзесят рублёў грашыма і каня, карову пасагу. Было ў Тахвілі з гэтай прычыны на вяку трое сватоў. Шчасьлівы папаўся быў адзін год: за сватамі дзьверы ў іх не зачыняліся — на адным тыдні ўсе трое прыяжджалі. Але праз Тахвіліны пераборы ды праз тое, што людзям не магла яна слова перапусьціць, раськідалася той год вясельле ў іх хаце. Дваім сватом Тахвіля адказала, што маладыя надта-ж беднага званьня былі: адзін парабак з двара, а другі шкляроў сын зь мястэчка. Трэція сваты былі лепшыя: малады быў гаспадарскі хлопец. Можа-б зь імі і лады былі, але праз свата, празь яго доўгі язык раськідалася ўсё. Благі той сват, што, дзе трэба, спрытна пагаварыць ня ўмее, але бяда, калі і залішне шалахтун. Будзе тады тое, што ў Тахвілі было.

З-за парогу пачаў ён гаворку як трэба, што прыехалі яны тавару паглядзець, а потым, як селі за стол, сказаў, як і ўсе ўмелыя сваты кажуць, — калі вымярхаліся зь вялікай дарогі ды ня церпіцца:

— Не на тое мы прысланы, каб быў стол засланы. Трэба, каб і на стале было.

Потым далей-болей... разгаварыўся сват з Тахвіліным бацькам і аж да такой мовы дагаварыўся:

— Можа вы і не залюбіце, але што трэба, то трэба сказаць. Гэта-ж, як той казаў, не на дзень, не на два, а да сьмерці пара будзе. Людзі ўсяк тут дзейкаюць, але у нас свае вочы ў ілбе ёсьць. Ці яно праўда ці не — можам пераканацца. Можа таго хваста ў вашай дачкі й заваду няма, можа пра ўсякае вядзьмацтва яна нічога і ў галаве ніколі ня мела, але як яно не на дзень, не на два, а на век робіцца, дык там надта і ўвярацца няма чаго. Усё на сьвеце можа быць.

Сват пачаў такую брыдэзную мову, а малады яму патакуе:

— Але, але! Трэба пераканацца.

Тахвіля слухала, слухала, а нарэшце як хапіла памяло з качарэжніку ды калі сунецца да стала.

— Вон! Каб вашага і шныру тут ня было. Што вы зубы продаць тут, за гэтым сталом, паселі?! Вон паскуды!

Па той раз — годзе сваты к Тахвілі езьдзіць. Казалі, хто бачыў гэта ўсё, што тады, хоць з пэнду бяз шапак выскачылі з хаты, але на вуліцы так апомніўся сват, што за гэтакі сорам хоць скляські хату трэба. Калі, забыўшыся, як яно тады было, людзі чаго з сваей галавы ня прылгалі, дык кляў ён гэтакімі слоўмі:

— Каб гэты двор, гэта хата па вокны гразьзю балотам заплылі; каб сюды добраму чалавеку ні падыйсьці, ні пад'ехаць было.

Кажуць нашы баркаўчане, што той сват, няначай, крыху вядзьмак быў, бо ўсё так і сталася, як ён скляў, калі праўда, што ён кляў гэнак. Сваты надалей крыжык у іх варотах палажылі. Болей ніхто ня прыяжджаў і ня прыходзіў: баяліся, каб Тахвіля, як што не пад лад, конна з хаты на іх ня выехала.

Тахвілі ня шкодзіць!

Ня была-б яна такая абрыджоная, не цярпела-б зьвягі ад людзей. Сама вінавата!

Трэба ёй ведаць усё, што дзе на сьвеце ёсьць. Дзе людзі сабраўшыся, трэба ёй, ціхенька прыслухоўваючыся, сунуцца туды. На сход даўней з жанок адны ўдовы (ды й то ўсяго тыя, у като-

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

«СДЕЛКА»

«Жывучы ўсяго дажывеш: і Кузьму татам назавеш» — кажа вялейская прыказка. Так і мне, жывучы, прыйшоўся сумліўнай вартасьці гонар: палемізаваць, або лепш — распраўляцца з «Аб'еднаньнем».

Кажучы шчыра, я часам маю ахвоту пахваліць гэтую газэтку за ейную сьціпласьць. Аўтары яе прынамся не перанатужваюцца на арыгінальнасьць і таму ім не пагражае мазгавая або якаясьці іншая руптура. Проста яны на пачатку — і таксама неарыгінальна — абложаць густым матам «крывічоў», пасьля перарататараць Купалу, Коласа ці Багдановіча, на заканчэньне — яшчэ раз цюкнуць на «крывічоў», урэшце, няма ведама на што, паставяць два параграфы і — фініс... Можна вытрываць...

У вапошнім, прыкладам, 2 (49) нумары, зусім удала перарататарылі вельмі цікавую працу пад загалоўкам «Беларускія Гімны». Усё, бо слова ў слова, згаджаецца з выданай у 1942 г. ў Бэрліне працай «Беларусь ў песьнях». Аўтар гэнай працы — Н. Л. — Абрамчык. Перадрук у «Аб'еднаньні», можна сказаць, зусім дакладны, толькі шкада, што на крыніцы забыліся паклікацца і перадрук падпісалі «Беларус у Амэрыцы» — Шукай, wo ist der Hund begraben... Але з гэтага ня варта было-б ім рабіць сцэны і можна запісаць на конта іхняга налогу, ды справу пусьціць у расход. Каб ня іншая загвоздка:

Вось-жа ў гэным нумары зьмешчаны ліст пані Руткоўскай пад загалоўкам «Дарагія Беларусы!». А гэтага ўжо ніяк пахваліць нельга. — Ані спадарыні Руткоўскай, ані «Аб'еднаньня»...

Папершае, ня можна пахваліць рэдакцыю за тое, што пусьціла такі няграматны ліст. Можна сп. Руткоўскай ня ведаць беларускай мовы, але хіба-ж у рэдакцыі павінен быць хтось адзін на завод і гэны няўдалы ліст падправіць. Бо так, аж вочы выдзірае...

Падругое: кажны беларускі часапіс, якому дарагая родная культура, не зьмясьціў-бы гэнага ліста, а калі-б навет зьмясьціў — не падмацаваў-бы яго сваімі, так нясымпатычнымі камэнтарамі, як гэта зрабіла «Аб'еднаньне».

Дзіўна непераконвальна гучыць загаловак «пасланьня» сп. Руткоўскай: «Дарагія Беларусы!». Ведама, што сп. Р. першая хуценька прыдбала ангельскі пашпарт і сталася «брытіш сабджэкт», што яна раз падаецца за Польку, другі раз за Расейку, беларускімі-ж праблемамі мала цікавіцца. — Гэта ей можна. Але скуль-жа такі патрыятычны патос, чаму ёй беларуская справа так лягла на сэрдэньку і чаго яна хоча?

«Пасланьне» ейнае ў скароце гучыць менш-больш так: «Дарагія Беларусы! Не давайце грошы на выданьне зборніка песьняў сьв. пам. Дзядзі майго Равенскага, бо крывічы робяць «сделку». Я прашу ад высылкі грошай (sic!) устрымацца, каб пасьля ніхто не памянуў ані мяне, ані імя дарагога Дзядзі крыўдай (sic!). Музыка майго дзядзькі (sic!) ніколі ня была палітычнай, яна была і павінна застацца заўсёды БЕЛАРУСКАЙ.»

Няўжо-ж выраблене вуха спадарыні доктар ня вычула хвальшывых тонаў, якія скрыгочуць у яе «пасланьні да народу»?

Няўжо-ж яна ня памятае, што ад імя студэнтаў прыгожую і перачуленую разьвітальную прамову над адчыненай труной дарагога вучыцеля — сказаў якраз ня крывіч? А гэная мова выціснула сьлёзы з вачоў прысутных, іхных пераконаньняў. Гэна была мова Беларуса.

Але тады сп. Руткоўская гэтага ня прыкмеціла, бо ня цікавілася беларускімі праблемамі і бадай ці ведала, што ёсьць паміж Беларусаў палітычныя розьніцы. Дык скуль-жа цяпер такое палітычнае усьведамленьне?

Не хачу ўваходзіць у сутнасьць сямейных суадносінаў сп. Р. зь сьв. пам. Прафэсарам Равенскім і гэта паміну. Усім, хто ведаў ды цікавіўся жыцьцём і творчасьцяй Прафэсара, ведамыя ягоная любоў і адданасьць беларускай культуры, якой Ён аддаў сваё прыгожае жыцьцё. Таму, хоць Ён і не напісаў тэстамэнту — апошняя воля Ягонага вялікага сэрца не насоўвае ніякіх сумліваў.

Беларускае грамадзтва годна ацаніла вялікія заслугі Песьняра і таму, бяз розьніцы палітычных перакананьняў, адгукнулася на палымяны заклік Яго ўлюбленых вучняў і пасьпяшылася з ахвярамі, каб выпаўніць волю Памёрлага. Толькі сп. Руткоўскай ня здрыганулася рука пісаць тэнае пісьмо, а рэдактару «Аб'еднаньня» — круціць гэта на рататары, дамайстроўваючы да яго сьлізенькія камэнтары...

У ўчынку сп. Р. можа быць проста штуршок матар'яльны. Але чаго там шукае «Аб'еднаньне»?..

Здарылася мне быць прыпадковым сьветкам, як усё, што засталося з маемасьці Сьв. П. Равенскага, было аддана да дыспазыцыі сп. Р. і яна, спакаваўшы ў чамаданы, вывезла.

Калі-ж ей расходзіцца пра эвэнтуальныя даходы з выданьня сьпеўніка — думаю, што й гэта ей, як ініцыятары, так і беларускае грамадзтва ахвотна аддасьць. На абцерце сьлёз. **Але музыка вялікага Песьняра была створаная для Народу і таму павінна ісьці ў Народ, а не ў чамаданы сп. Руткоўскай!**

Яна нядвузначна пагражае судовай справай. — Хай-жа ведае, што хоць Беларусы і спрачаюцца між сабой, яшчэ да чужацкіх судоў не хадзілі і сп. Руткоўская ім туды дарогі не пакажа.

Усё-ж, калі можна зразумець яе гістэрыю, дык злой волі «Аб'еднаньня» — ніяк. Ня ведаю, колькі ёсьць праўды ў тым, што я чуў у Лёндане: быццам-бы гэта ўсё зьяўляецца вынікам інтрыгаў «лідэраў» спад знаку «Аб'еднаньня», але ўсё-ж такі, што брыдка, то ня прыгожа...

Кажуць часам: «Грэх можа і не цяжкі, але сьвінства — вялізарнае». Я буду лагаднейшы і стравэстую: Калі грэх тут не сьмяротны, дык нятакт — нявыбачальны...

П. Сыч

Выясьненьне

У «Беларускім Эміграньце» № 4 (52) за красавік 1953 г. была надрукаваная карэспандэнцыя аб другім гадавым зьезьдзе прадстаўнікоў беларускіх арганізацыяў у Аўстраліі. У сувязі з тым, што зьмест карэспандэнцыі не адказвае рэчаіснасьці, гэтым ветліва просім зьмясьціць у Вашай газэце наступнае:

У Каардынацыйны Камітэт Беларускіх Арганізацыяў у Аўстраліі на другім гадавым зьезьдзе прадстаўнікоў беларускіх арганізацыяў у Аўстраліі былі выбраныя: сп. сп. М. Скабей — старшыня, Р. Трысмакоў — заступнік старшыні і М. Нікан — сакратар.

Адрас Каардынацыйнага Камітэту:
42, Clifton St., Northcote, Vic., Australia.

Выдавецтва інфармацыйнага бюлетэню даручана сп. сп. М. Лужынскаму і У. Бакуновічу.

Прэсавае прадстаўніцтва на Новую Паўдзённую Валію:
Mr. John Čarnecki, 306, Sandgate Rd., Shortland, N.S.W., Australia.

На Вікторыю:
Mr. L. Pašynkouski, 60, Stawell St., Burnley, Melbourne, Vic., Australia.

Ува ўсіх справах, што датычаць Каардынацыйнага Камітэту й беларускага жыцьця ў Аўстраліі просім зьвяртацца на вышэй пададзены адрас.

Каардынацыйны Камітэт Б.А.А.

ЧЫТАНЬНЕ «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ» ЗАДАРМА — ЗЯЎЛЯЕЦЦА НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ПРАСТУПКАМ

Ужо выйшла й прадаецца асобнай кніжкай

аповесьць

АНДРЭЯ МРЫЯ (АНДРЭЯ ШАШАЛЕВІЧА)

Запіскі Самсона Самасуя

Заказы можна ўжо пасылаць на адрас нашых Прадстаўнікоў у пасобных краінах або непасрэдна на адрас нашага Фінансавага Прадстаўніка ў Лювэне:

Janka Žučka, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.

Цана аднэй кніжкі — 1 амэр. даляр або ягоная раўнавартасьць у мясцовай валюце.

ВЫЙШАЎ З ДРУКУ І ЎЖО ПРАДАЕЦЦА № 25 ЗА ЖНІВЕНЬ ЧАСАПІСУ БЕЛАРУСКАЕ МОЛАДЗІ

НАПЕРАД

Часапіс зьмяшчае шмат багатага публіцыстычнага й літаратурнага матар'ялу, зьяўляецца прыгожа ілюстраваным і абыймае 80 балонаў друку вялікае васьмёркі.

Адрыс Рэдакцыі: «NAPIERAD», 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.

Цана асобнага нумару 50 амэр. цэнтаў або іхная раўнавартасьць у мясцовай валюце.

Хто можа выэміграваць у Амэрыку

Падпісаны прэзыдэнтам Айзэнгаўэрам 7 жнівеня сёлета новы іміграцыйны закон, які дапушчае на працягу двух наступных год дадатковую колькасьць імігрантаў у ЗША ў вышыні 214,000 чалавек, дасьць магчымасьць выэміграваць у Амэрыку галоўна Немцам і некаторай, хоць невялікай, колькасьці ўцекачоў з за зялезнай заслоны, для якіх прадугледжана 35.000 месцаў. Гэтая апошняя сума 35.000 чалавек дзеліцца на рад паасобных катэгорыяў. Зь іх успомнім тут толькі тыя, якія могуць датычыць і Беларусаў.

На галоўную ўвагу заслугоўвае катэгорыя ўцекачоў, якія знаходзяцца ў Заходняй Нямеччыне, у заходнім Бэрліне або ў Аўстрыі, а якія баяцца павароту на бацькаўшчыну з прычыны перасьледваньняў рэлігійных, нацыянальных або палітычных. Дзеля таго, што новы эміграцыйны закон ня робіць ніякага абмежаваньня што да тэрміну прыбыцьця гэтых уцекачоў на Захад, зьяўляецца ясным, што ў гэтай катэгорыі зьмяшчаюцца як старыя ДП, што не змаглі ў свой час з тых або іншых прычынаў выэміграваць у ЗША, так і тыя, што прыбылі пасьля 1949 году і яшчэ могуць прыбыць на Захад у будучыні.

Наступнай катэгорыяй уцекачоў, пад якую могуць падпасьці Беларусы, гэта катэгорыя ўцекачоў, якія цяпер знаходзяцца на тэрыторыі дзяржаваў Атлянтычнага пакту, але паложаных на эўрапэйскім кантынэньце. Для яе загарантавана законам 10.000 візаў. Ходзіць тут пра такія краіны, як Францыя, Італія, Бэльгія, Галяндыя, Люксэмбург, Партугалія, Нарвэгія й Данія. Амэрыканскі Кангрэс далучыў да гэтых краінаў яшчэ Швэцыю, хоць яна не належыць да Атлянтычнага пакту. Так як у законе гаворыцца пра краіны Атлянтычнага пакту, паложаныя на кантынэньце, уцекачы, што пражываюць у Ангельшчыне, з гэтай катэгорыі выключаюцца.

Частка Беларусаў зможа скарыстаць з катэгорыі, для якой загарантавана 2.000 візаў, а якая абыймае жаўнераў польскіх вайсковых фармацыяў з апошняй вайны, што сяньня пражываюць у Ангельшчыне. З гэтае катэгорыі могуць скарыстаць тыя Беларусы, пражываючыя ў Ангельшчыне, што былі ў польскім корпусе генэрала Андэрса.

Новы іміграцыйны закон не прадбачыць стварэньня спэцыяльнай арганізацыі, якая мела-б арганізаваць эміграцыйную акцыю, якой у свой час была г. зв. «ДП-Камісія». Уся адміністрацыя новага закону будзе знаходзіцца ў руках амэрыканскіх кансулятаў, а наглядаць за гэтай акцыяй будзе прадстаўнік амэрыканскага міністэрства замежных справаў Робэрт Ц. Александар, заступнік дырэктара ўраду візаў. Для кажнага кандыдата для эміграцыі ў ЗША павінен быць прадстаўлены ў бюры сп. Аляксандра г. зв. «Афідавіт» (падобна як раней «ашуранс»), у якім будзе загарантаваная праца й памешканьне ў Амэрыцы. Не патрабуюць такіх «афідавітаў» блізкія сваякі амэрыканскіх грамадзянаў.

Кошты транспарту ўцекачоў, якія ня могуць іх аплаціць самі, будзе пакрываць Міжнародны Міграцыйны Камітэт у Жэнэве, дырэктарам якога зьяўляецца сп. С. Гібсон. Кошты падарожжа ўцекачоў з амэрыканскіх партоў да іхнага месца працы могуць пакрываць грамадзкія арганізацыі, якім новы закон прызнае на гэтую мэту 5 мільёнаў даляраў пазычкі зь дзяржаўных фондаў.

Усе дырэктывы нармальных іміграцыйных візаў ці г. зв. права Мэк Кэрана, датычаць і новых эмігрантаў. Гэта абазначае, што, хаця былыя сябры камуністычных арганізацыяў будуць выключаныя ад эміграцыі, але, калі яны дакажуць, што мусілі належыць да гэтых арганізацыяў для собскае бясьпечнасьці, утрыманьня й працы, дык забарона гэтая можа быць адхіленая. Паводля інфармацыяў міністэрства замежных справаў ЗША, першыя візы ў рамах новага закону будуць выдавацца ўжо за два-тры месяцы.

ШУКАЮЦЬ

Дзядзьку Міхала Коніцького, зь сяла Дзярэўная, Кабрынскага павету, на Палесьсі, шукае братанак Леонці Коніцькі, з тых-жа самых старон, які пражывае цяпер у Аргентыне. Весткі слаць на адрас: Leontij Konyckyj, c. Isleta 3202, Valentin Alsina, Prov. Buenos' Aires. Argentina.

Шарко Жоржа зь вёскі Сенна шукае Сіўка Мікола. Весткі слаць на адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

Нашыя Прадстаўніцтвы

Ангельшчына:
Mr. Aleksander Lašuk, 97 Moore Park Road, London S. W. 6.

Бэльгія:
Mr. Borysevič, 19, Place Hoover, Louvain.

Данія:
J. Lobejko c/o H. C. Jensen, Leifsgade 6 III tv. Kobenhavn S.

Францыя:
a) **Zygfryd Puzowski,** 158, rue Jules Guesde Levaillois-Perret (Seine).
b) **Bonifacy Prytycki,** 17, rue Roger Salengro Lys les Lannoy (Nord).

Швэцыя:
Basil Lukaszyk c/o Hammer Ringvagen N. 123/III, Stockholm.

Аргентына:
Asociacion Bielorusa en la Argentina. Calle Coronel Sayos 2981, 4 de Junio, Prov. Buenos Aires.

Аўстралія:
Mr. Donat Jackievič, 60 Fisher St., East Brisbane, Q-ld.
b) **Mr. L. Pašynkouski,** 60 Stawell St. Burnley, Melbourne, Vic., Australia.
c) John Čarnecki, 306, Sandgate Rd., Shortland, N.S.W.

Бразылія:
Carlos Cimafejčyk, Prasa 76, Tiridentes, Curitiba - Parana.

Канада:
Mr. W. Nowicki, 142 Gladstone Ave, Toronto, Ont.
b) **Mr. Franz Hankievich,** 3701 St. Dominique St., Montreal, Q.

ЗША:
a) **Mr. B. Danilovich,** 222 Suydam St., New Brunswick, N. J.
b) **Mr. M. Serdeczenko,** 7851 Sherwood Ave, Detroit 11, Mich.
c) **Mr. V. Dunec,** 2502 W. 7. St., Cleveland, Ohio.
d) **Mr. E. Budzka,** 723 W. Dekoven St., Chicago 7, Illinois.

Новая Зэляндыя:
Mr. Marian Karanieuski, 88, Hercules Drayve, Roxburg-Hydro.

З гэтых Прадстаўніцтваў просім у пасобных краінах выпісваць «Бацькаўшчыну» й на іх адрас перасылаць за яе належнасьць.

З прычыны дэвізовых абмежаваньняў просім усіх нашых Прадстаўнікоў выручаныя за газэту грошы, як і за выдадзеныя «Бацькаўшчынай» кніжкі, перасылаць на адрас нашага фінансавага Прадстаўніка ў Бэльгіі:
Janka Žučka, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.

рых вялікіх сыноў няма) хадзілі. З хаты ўсяго па чалавеку даўней ішло на сход. А Тахвіля — няма дуру, што зь іх хаты бацька на сходзе — шамуль-шамуль, ды зараз і яна там ёсьць. Ды хоцьбы, туды прышоўшы, як удовы, пастаяла дзе ззаду, паслухала. Дык — не: ёй трэба напярэдзе быць. Уцісьнецца ў самую сярэдзіну, дзе гаваркіх людзей болей, ды стаіць. Каб лепш усяго даслухаць, каб перад ёю сьмела гаварылі ўсё, ззамоладу глухою прытварылася. Ніколі ад першага разу не адкажа чалавеку, калі той у яе чаго пытае.

— Што? Што ты кажаш? — яшчэ яна ў яго папытаецца.

Калі добра, дык за другім разам адкажа, а не — то 'шчэ болей памуштруе: трэці раз мацней папытаць прымусіць.

— Ну — хоць забі — ня чую! — скажа і рукі распатрэ. Хустку над вушмі падыме, каб лепей слухаць было.

На сход прыдзе ды калі ў што лепш уверыцца хоча, хоць і чула яго, а папытаць трэба. Таўхане памаленьку каго пад бок.

— Як?.. Што ён казаў?!

Калі нарвецца на такога чалавека, што ня цяжка яму слова сказаць, дык:

— Ага! Вунь яго як! — скажа, другі раз ад добрага чалавека тое самае пачуўшы.

Толькі што нямавернікі нашы людзі ня далі яны Тахвілі веры, што так — бяз дай прычыны — можна глухім стаць. Прабавалі яны ў Тахвілі прасіць, каб пазычыла чаго. Тройчы пытацца прышлося, а яна ўсё ніяк пачуць не магла.

— Але-ж — хоць забі — нічога ня чуваць, — казала.

Тады другі раз, на спрактыкаваньне, давай перад ёю жанкі гаварыць, што надта-ж гэтага году ў дварэ заработкі добрыя: ня два злоты, а паўрубля за дзень на сене даюць. На ўсё Тахвіля забылася, гэта пачуўшы. Падступілася яна бліжэй ды й пытае:

— На якіх-жа луках яго сушаць, гэна сена?

Тады баркаўчане і дазналіся, што толькі «дай» Тахвіля ня чуе, а на «на» ў яе вуха востра. І от за гэта прытвараньне ды за тое, што ўсюды любіць уваткнуць свой нос, і зьненавідзелі Тахвілю нашы людзі. Хаты замыкаюць і самі хаваюцца, як яна ідзе да каго на двор. А дзецям загадаюць, каб праз вакно крычалі:

— У нас няма нікога дома — толькі мы адны.

Сама сябе Тахвіля не шануе.

Яшчэ маладою дзяўчынаю яна была, яшчэ сваты езьдзілі, а ўжо цягнула яе людзям якую раду даць. Хоць ціхенька — каб ніхто ня ведаў — хоць усяго сваяком, на каго спадзявалася, што нікому ня скажуць, але прабавала вогнік адкідаць — над вугольчыкамі ўжо ўмела яна шаптаць. А па Цыпруянавай сьмерці і саўсім варажбіткаю стала. Ужо і ад людзей не хавалася. Край сьвету сталі знаць Тахвілю, сталі езьдзіць у Баркаўцы лячыцца. Умее цяпер Тахвіля і ад вужакі хлеб даваць, і навязкі навязваць, і рожу, і ўсе 12 трасцаў лячыць.

Цыпруяна даўней у Баркаўцох за ведзьмака мелі.

Як ён жыў, я ня помню, а распытацца ня было часу. Толькі чуў, казалі — адступіўся ад яго перад сьмерцю і Бог і людзі. Кінулі яго сыны аднаго ў старой хаце канаць. І да таго-ж былі яны трывалага сэрца, што Баркаўцы разьлягаліся ад Цыпруянавага стогну, а яны і не падступіліся к бацьку папытацца, чаго яму хвораму трэба: ці вады падаць, ці так чаго даць зьесьці. Другім баркаўчанам не вялікая бяда па Цыпруяну — ён ім ніякі свой, ад яго-ж стогну толькі страх нападаў. Адна Тахвіля вядзьмацкай сьмерці не пабаялася — дарма што чужая, да самай сьмерці даглядала яго.

Калі праўда, што людзі кажуць, дык ведзьмакі ня так, як усе паміраюць. Іх душа ня гладкая, а карані папускаўшы ў чалавеку сядзіць — сама скора выскачыць ня можа; як сьмерць прыдзе, чэрці з крукамі прыляцяць ды самахцом яе дзяруць. Ад гэтага і боль, а чалавеку канаць, разьбіраюць людзі столь, расьцягваюць страху над ложкам, дзе вядзьмак пры сьмерці ляжыць. Каторы не такі зайздросны вядзьмак, таму скарэй прыдзе сьмерць. Ня так доўга будзе ён на сьвеце пакутваць, калі перад гэтым адкажа свае замовы павяронаму якому чалавеку. Тады ня так моцна ў ім душа сядзіць, барзьдзей яе чарты, крукамі падчапіўшы, на верх выцягнуць.

Баркаўчане, пакуль Тахвіля па Цыпрыяну не спагадала, ня стала яго даглядаць, блізка пад тую хату, дзе вядзьмак канаў, баяліся падступіцца, а цяпер іх цікавасьць перамагла страх. Удзень нязручна па падваконьню стаяць, падглядаць. А як крыху зьмеркнецца, дык і абстануць нашы людзі тую хатку, усёроўна як там гарыць, ды 'шчэ агонь на верх ня выбіўся. Як ня б'юцца адзін з адным, каб даступіцца ў вакно паглядзець.

І казалі — праўда ці не — што дасьледзілі, даслухалі, як Тахвіля прасіла ў Цыпруяна, каб ён ёй свае варагі перад сьмерцю адказаў.

— Вам-жа, — казала — самім лягчэй будзе.

— Не! Няможна, дзеткі. Я зарокся з сабою іх у дамавіну забраць. Як роднаму бацьку гладзіла яна ласкаваю рукою яго пакудлачаныя валасы.

— Дзядзечка!..

А ён адхінаецца, прымае Тахвіліну руку з свае галавы.

— ...Няможна, дзеткі!

— ...Даражэнькі, залаценькі!.. Ну няўжо вас ня ўпросіш?! Няўжо вы такія акаянныя?! Дзядзечка!..

І такі ўмалёгала Тахвіля старога ведзьмака. Казаў ён:

— Ты мне чужая-чужаніца, а лепш за родную дачку.

Адказаў Цыпруян усё, што сам ведаў. Наўчыў як, у якую пару, рабіць што, ды й прышоў на яго канец таго дня пад вечар.

Дзіва няма, што з таго часу саўсім за ведзьму нашы людзі сталі Тахвілю мець. Дзіва няма, што на Купальле, кажуць, робіцца яна чорным катом ды ходзіць па людзкіх хлявох з дайніцаю даіць чужых кароў.

Пасьля гэнага, усё на Тахвілю можна сказаць, і ідзіва ня будзе.

(Далей будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011